штотыднёвая грамадска-палітычная газета

№ 23 (1619)

КУЛЬТУРА

10 чэрвеня 2023 г.

У Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў. Фота: БелТА

З клопатам пра новую генерацыю

Падтрымка маладога пакалення — адзін з прыярытэтаў беларускай дзяржавы. І ў сферы культуры асабліва актуальныя пытанні прыцягнення новай генерацыі. Нельга не прыкмеціць дзейнасць профільнага міністэрства ды іншых органаў у гэтым кірунку — ад дапамогі юным талентам, якія пачынаюць творчы шлях, да клопату аб спецыялістах, што толькі атрымалі прафесію і асвойваюцца на першым працоўным месцы.

Рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі ў нашай галіне было прысвечана нядаўняе пасяджэнне выязной калегіі Міністэрства культуры ў Магілёве. Удзельнікі нарады акрэслілі дасягненні і перспектывы ў падрыхтоўцы работнікаў сферы.

Сёння ў фестывальным Маладзечне праходзіць II Рэспубліканскі форум маладых спецыялістаў установаў культуры. Да сустрэчы далучыліся настаўнікі і канцэртмайстры дзіцячых школ мастацтваў, выкладчыкі каледжаў, прадстаўнікі цэнтраў культуры, музеяў і бібліятэк. Адмыслоўцы могуць падзяліцца надзённымі праблемамі, задаць пытанні, выказаць ідэі і пажаданні кіраўніцтву галіны. Таксама візіт на форум — гэта шанц завесці карысныя знаёмствы, абмяняцца вопытам з калегамі і, вядома, атрымаць незабыўныя ўражанні ад яркіх імпрэз Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2023”.

Працяг тэмы — на стар. 4

МУЗЕЙНАЯ ПЛОШЧА
Віртуалізацыя і дыстанцыйны доступ. Новыя мадэлі ўзаемадзеяння музеяў
стар. 5

ТЭМА
Ці існуе сучаснае мастацтва? Пункт гледжання па той бок карціны
стар. 7

З ВАНДРОЎКІ
Рэкламы не стае! Спрэчка ля сувенірнай паветкі
стар. 11

КІНАПРАГЛЯД
Не відовішчна, а ўбачыць ёсць што. Касавыя зборы і піяр-кампанія прэм’еры
стар. 12

Стратэгія Першага

“Мастацтва вечнае, а імкненне народаў да дружбы і міру пераадольвае і пераадолее любыя перашкоды”.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

Графік асабістага прыёму грамадзян у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь

- Міністр **Маркевіч Анатолій Мечыслававіч** — першая серада месяца з 8.00 да 13.00.
- Першы намеснік міністра **Грамада Валерый Іванавіч** — трэцяя серада месяца з 8.00 да 13.00.
- Намеснік міністра **Саракач Сяргей Аляксандравіч** — другая серада месяца з 8.00 да 13.00.
- Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Дрыга Ірына Уладзіміраўна** — чацвёртая серада месяца з 8.00 да 13.00.
- Начальнік аддзела па кінематаграфіі **Панамарова Кацярына Валер’еўна** — першы аўторак месяца з 14.00 да 20.00.
- Начальнік аддзела бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці **Гурыновіч Ала Мар’янаўна** — першы аўторак месяца з 8.00 да 13.00.
- Начальнік фінансава-эканамічнага ўпраўлення **Крупко Святлана Іванаўна** — другі аўторак месяца з 8.00 да 13.00.
- Начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці **Карповіч Ірына Уладзіміраўна** — другая серада месяца з 8.00 да 13.00.
- Загадчык сектара мастацтвазнаўчаў-экспертаў па вывазе культурных каштоўнасцей з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь упраўлення прафесійнага мастацтва галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Козыраў Глеб Мікалаевіч** — штодня з 8.00 да 12.00, з 13.00 да 17.00.
- Начальнік аддзела кадравай работы і дзяржаўных узнагарод **Германовіч Вольга Міхайлаўна** — першы аўторак месяца з 8.00 да 13.00.
- Начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння **Бартошык Аляксандр Аляксандравіч** — трэцяя серада месяца з 8.00 да 13.00.
- Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны **Жук Таццяна Віктараўна** — першы чацвер месяца з 14.00 да 20.00.

Папярэдні запіс на асабісты прыём вядзецца па тэлефоне 8 017 2037574. Падрабязнасці — на сайце kultura.by.

Энергія. Бадзёрасць. Прыгажосць

Рэспубліканская спартакіяда работнікаў культуры па летніх відах спорту прайшла з 2 па 4 чэрвеня ў комплексе “Раўбічы”.

На спаборніцтвы з’ехаліся 29 камандаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Сярод удзельнікаў і прадстаўнікі галіновага міністэрства. Праграма ўключала турніры па васьмі відах спорту: пляжным валейболе, міні-футболе, летнім біятлоне, дартсе, фігурным ваджэнні веласіпеда, настольным тэнісе, гіравым спорце, а таксама па перацягванні каната. У кожным першынстве былі вызначаны пераможцы ў індывідуальным заліку як сярод мужчын, так і сярод жанчын.

— Наша прафесія дыктуе свае ўмовы: праца 24 на 7. Разам з тым мы заўсёды знаходзім магчымасць пабыць на спартыўных пляцоўках, прасякнуцца спартыўным духам і атрымаць незабыўныя эмоцыі, — адзначыў міністр культуры **Анатолій Маркевіч** падчас урачыстага адкрыцця XVI Рэспубліканскай спартакіяды работнікаў культуры па летніх відах спорту. — Мы сваім узорам даказваем, што энергія, бадзёрасць, прыгажосць у любым узросце — гэта рэальна і гэта класна.

У агульнакамандным першынстве перамагла зборная Гомельскай вобласці, другое месца — у Белдзяржфілармоніі, трэцяе — у Мінскай вобласці. Заслужаныя медалі атрымала і каманда Міністэрства культуры — за першае месца ў фігурным ваджэнні веласіпеда і другое ў летнім біятлоне.

Эмоцыямі падзяліліся ўдзельнікі спартакіяды.

Мікалай Разумейка, капітан каманды Гомельскай вобласці, кіраўнік фізічнага выхавання Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Н. Ф. Сакалоўскага:

— Мы ўпершыню ў Раўбічах. Спартыўны комплекс цудоўны! Уся каманда пад уражаннем! Спаборніцтвы прайшлі на высокім узроўні, але нам яшчэ ёсць над чым працаваць. Напрыклад, мы не былі гатовыя да гульні на пясчанай валейбольнай пляцоўцы. Аднак гэта не зламіла баявы дух, прыстасаваліся — і занялі першае месца! Падобныя мерапрыемствы карысныя для прапаганды здаровага ладу жыцця, для таго, каб гэтымі прынцыпамі кіравалася кожная сям’я і кожны чалавек. Супрацоўнікі нашай сферы павінны не забываць, што поруч з музыкай, тэатрам ды іншымі відамі мастацтва ў адным шэрагу стаіць фізічная культура, бо ад яе залежыць здароўе ўсёй нацыі.

Алена Мазан, чалец каманды Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Нясвіж”:

— Вяртаемся дадому толькі са станоўчымі эмоцыямі. Добрае ўражанне пакінула арганізацыя мерапрыемства, таксама яркімі эмоцыямі зарадзілі ўсе каманды. У спартакіядзе я ўдзельнічаю другі раз, у 2022 годзе заняла першае месца па фігурным ваджэнні веласіпеда. Хоць сёлета па агульных балах удалося ўзняцца толькі на другую прыступку п’едэстала, гэта не азмрочыла агульны настрой свята. Мы з камандай узялі ганаровае трэцяе месца ў перацягванні каната. Спартакіяда аб’ядноўвае не толькі калектыў установы, але і ўсю рэспубліку. Галоўнае не ўзнагароды, а згуртаванне работнікаў культуры, бо менавіта разам мы — сіла.

Ад паказчыкаў да заробкаў

На чарговай апаратнай нарадзе ў міністра культуры Анатолія Маркевіча 6 чэрвеня было разгледжана шырокае кола пытанняў — ад выканання асобных галіновых праграм да магчымасцей павышэння заробкаў працаўнікам сферы культуры.

Перадусім кіраўнік ведамства звярнуў увагу на зніжэнне эфектыўнасці выканання Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” з высокай у 2021 годзе да сярэдняй у 2022-м. Міністр прапанаваў штоквартальна рабіць зводную ацэнку выканання ўсіх паказчыкаў праграмы, каб галіна выканала ўзятыя абавязкі.

Асобна гаварылі пра падпраграму “Культура” Праграмы развіцця Аршанскага раёна. Падкрэслівалася, што гэта апошні год рэалізацыі, калі падводзяцца вынікі па выкананні даручэнняў Прэзідэнта краіны. Анатолій Маркевіч адзначыў, што галіна павінна ажыццяўляць сваю функцыю, а колькасць мусіць пераходзіць у якасць.

Падчас абмеркавання ўдзелу беларускай дэлегацыі ў фестывалі Саюзнай дзяржавы “Творчасць юных” міністр зрабіў слушную заўвагу пра важнасць асвятлення форуму сродкамі масавай інфармацыі. Што да іншага саюзнага праекта, то Маладзёжны сімфанічны аркестр Анатолій Маркевіч прапанаваў зрабіць пастаянным і далучыць да ініцыятывы навучэнцаў сярэдніх прафесіянальных музычных устаноў. А яшчэ ўзняць пытанне аб фарміраванні гэтага калектыву на парытэтных пачатках.

Кіраўніцтва галіны таксама заслухала справаздачы аб найбліжэйшай перспектыве беларуска-расійскага ўзаемадзеяння ў культуры, бягучых пытаннях падрыхтоўкі да фестывалю “Музычныя вечары ў Мірскім замку” і Рэспубліканскага балю выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі. Арганізацыя гэтых падзей ідзе адпаведна плану.

Пасля разгледзелі вынікі працы кінематаграфістаў. Было агучана, што ў красавіку ў Расіі прэзентавалі серыял з дзевяці эпізодаў “За паўгадзіны да вясны” пра “Песняроў”. У Беларусі яго мяркуе трансліраваць “АНТ”. На 18 чэрвеня намечана прэм’ера карціны Аляксандра Яфрэмава “Ліст чакання”. Таксама працягнецца праца над фільмам “На іншым беразе”. Прэм’еру стужкі прымяркуюць да Дня народнага адзінства, 17 верасня.

Напрыканцы нарады Анатолій Маркевіч паведаміў, што прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі правяраюць памеры даплат па кантрактах работнікам сферы культуры. Высвятляецца, што гэтыя даплаты не максімальныя. Ёсць заканадаўчыя магчымасці падняць заробкі пэўным супрацоўнікам. “Мы заклікаем павышаць заробкі ў сферы культуры. Таму павінны бачыць карціну цалкам і вырашыць пытанне з мясцовымі выканкамамі, каб яны заклалі неабходныя сродкі ў бюджэты наступнага года. Кіраўнікі выканкамаў з разуменнем да гэтага ставяцца”, — падкрэсліў міністр.

Мінск — Хашымін: дамовіліся

Беларусь надае прыярытэтнае значэнне адносінам з В’етнамам. Аб гэтым заявіў першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада падчас візіту ў Хашымін.

Дыялог нашых краін развіваецца ў розных напрамках і сферах. Але менавіта культура і мастацтва выконваюць асаблівую ролю — духоўна збліжаюць людзей. Сутнасна гэтаму садзейнічае і правядзенне абменных Дзён культуры ў Беларусі і В’етнаме. Чарговыя мерапрыемствы праходзілі з 24 па 26 мая: у Хашымін дэлегацыя нашай рэспублікі адправілася на чале з першым намеснікам міністра культуры Валерыем Грамадой.

Праграма Дзён культуры Беларусі ў В’етнаме была вельмі насычанай. Сярод галоўных падзей — сустрэча з намеснікам старшыні Народнага камітэта Хашыміна Зыонг Ань Дыкам, на якой былі абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва ў галіне культуры, намечаны перспектывы яго далейшага развіцця.

— Летась у Хашыміне адкрыта Генеральнае консульства Беларусі. Гэта яркае сведчанне таго, што наша краіна надае прыярытэтнае значэнне адносінам з В’етнамам. Беларусь заўсёды з павагай і цеплынёй ставілася да в’етнамскага народа, вядомага ідэйнай устойлівасцю і працавітасцю, старажытнай гісторыяй і багатымі культурнымі традыцыямі, — падкрэсліў Валерый Грамада. Ён адзначыў вялікі патэнцыял міжрэгіянальных абменаў Мінска і Хашыміна (у 2008 годзе гарады атрымалі статус пабрацімаў) у культурна-гуманітарнай сферы і выказаў упэўненасць, што культурныя абмены паміж дзвюма краінамі будуць спрыяць развіццю супрацоўніцтва, далейшаму ўмацаванню міжасобасных сувязей, добразычлівых адносін дзяржаў.

Важнай падзеяй сталі перагаворы першага намесніка міністра культуры Беларусі Валерыя Грамады і намесніка міністра культуры, спорту і турызму В’етнама Та Куанг Донга — па выніках была падпісана Праграма супрацоўніцтва ў галіне культуры на 2023—2025 гады.

Бакі дамовіліся развіваць і ўмацоўваць узаемадзеянне, спрыяць усталяванню прамога супрацоўніцтва паміж бібліятэкамі, музеямі, тэатрамі, творчымі саюзамі, аб’яднаннямі і арганізацыямі, а таксама ўстановамі, якія займаюцца пытаннямі рэстаўрацыі, захавання і развіцця культурнай спадчыны абедзвюх краін.

Асаблівая ўвага будзе нададзена пытанням падрыхтоўкі і правядзення Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Сацыялістычнай Рэспубліцы В’етнам і Дзён культуры Сацыялістычнай Рэспублікі В’етнам у Рэспубліцы Беларусь.

Сярод асноўных напрамкаў супрацоўніцтва — абмен выкладчыкамі, аспірантамі, студэнтамі, стажорамі, экспертамі, якія вывучаюць музычнае, тэатральнае, цыркавое, выяўленчае і народнае мастацтва, бібліятэчную і музейную справу, ахову і рэстаўрацыю помнікаў, для ўдзелу ў канферэнцыях, сімпозіумах і сустрэчах, што ладзяцца ў абедзвюх дзяржавах.

Таксама бакі дамовіліся спрыяць усталяванню прамых сувязей паміж арганізацыямі кінематаграфіі, заахвочваць паказы фільмаў іншага боку на сваёй тэрыторыі і ўдзел у міжнародных кінафестывалях, якія праводзяцца ў Беларусі і В’етнаме.

З назначэннем!

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі — новы генеральны дырэктар. Ім стаў **Вадзім Гігін**, які ўзначальвае рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб’яднанне “Беларускае таварыства «Веды»”.

Вадзім Гігін — кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Мае больш чым 20-гадовы вопыт выкладання і навуковай дзейнасці. Працаваў галоўным рэдактарам часопіса “Беларуская думка”, дэканам факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. З’яўляецца членам калегій Міністэрства інфармацыі і Міністэрства адукацыі, уваходзіць у склад Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, экспертнага савета па філасофіі, паліталогіі і сацыялогіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Прадстаўляючы новага генеральнага дырэктара калектыву, міністр культуры Анатолій Маркевіч адзначыў:

— Кіраваць “алмазам ведаў” — ганарова і адначасова вельмі адказна. Нацыянальная бібліятэка Беларусі — галоўная ўніверсальная навуковая бібліятэка краіны і сістэмаўтваральнае звяно яе адзінай бібліятэчнай прасторы, сімвал нашай дзяржавы.

Міністр звярнуў увагу, што пры арганізацыі работы Вадзіму Гігіну неабходна будзе вырашаць шэраг пытанняў. Сярод галоўных — кадравае забеспячэнне, умацаванне матэрыяльнай базы ўстановы, стварэнне аўтаматызаванай сістэмы “Электронная бібліятэка”, метадычнае суправаджэнне і кантроль дзейнасці публічных бібліятэк краіны.

“Спяваючая краіна” — у Мінску, “Вытокі” — у Баранавічах, “Планета пад назвай Маладосць” — у Глыбокім. Канцэртна-танцавальнымі, культурна-спартыўнымі, тэатралізавана-забаўляльнымі праграмамі сустрэлі чэрвень у розных кутках Беларусі: Міністэрства культуры аднавіла традыцыю правядзення летніх імпрэз у гарадскіх парках.

У гарадскім садзе грае...

Старт творчай ініцыятыве даў Мінск: 3 чэрвеня ў Аляксандраўскім скверы выступіў Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча. Гэта першы канцэрт у межах цыкла “Губернатарскі сад”. Мерапрыемствы будуць праходзіць па суботах каля Купалаўскага тэатра. Да прыкладу, сёння жыхары і госці сталіцы змогуць убачыць праграму “Народны спеў сэрца сагрэў” у выкананні ансамбля народнай музыкі “Свята” Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Тым часам у Брэсце гарадскі духавы аркестр зайграе для мінакоў на вуліцы Савецкай. На набярэжнай ракі Мухавец клуб сацыяльных танцаў Цэнтра культуры ладзіць сваю праграму.

Творчыя калектывы Віцебска прадэманструюць таленты ў парку імя Фрунзэ, а ў комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі правядуць тэматычны дзень “Адпачываем усёй сям’ёй!”.

Не будуць пуставаць і эстрадныя пляцоўкі ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі, у парку каля Палаца творчасці дзяцей і моладзі, у скверах імя А. Грамыкі, П. Галавачова: дзіцячыя школы мастацтваў і ўстановы культуры горада над Сожам прэзентуюць разнастайныя праграмы.

У Гродне эстафету летніх канцэртаў распачаў духавы аркестр дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 1 імя Ю. У. Семянякі. Сёння ў парку Жылібера — імпрэза народнага аркестра рускіх народных інструментаў, аркестра баянаў Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа.

Шмат цікавага чакае і жыхароў іншых рэгіёнаў. У графіку канцэртных выступленняў выхаднога дня калектываў і выканаўцаў мастацкай творчасці ў парках, скверах, іншых зялёных зонах абласных і буйных раённых гарадоў — амаль паўтары тысячы мерапрыемстваў!

Пазнаёміцца з праграмай падрабязней можна на сайце Міністэрства культуры

Віншуем!

На III Форуме медыйнай супольнасці Беларусі “Кросмедыйная журналістыка: тэхналогія і інструментарый” у Брэсце адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў XIX Нацыянальнага конкурсу “Залатая ліцера”.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Культура і мастацтва” — сярод лідараў спаборніцтва. У намінацыі для абласных, раённых, гарадскіх, карпаратыўных друкаваных СМІ, інфармагенцтваў, сеткавых выданняў “Найлепшыя матэрыялы культуралагічнай, гісторыка-краязнаўчай тэматыкі” дыпломам лаўрэата адзначаны праект часопіса “Мастацтва” — “Творцы Беларусі для краіны і ў імя яе”.

Дні культуры Беларусі ў Кыргызскай Рэспубліцы пройдуць 13—14 чэрвеня.

Упершыню!

У праграме — Дні беларускага кіно, выстава элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, гала-канцэрт айчынных майстроў мастацтваў. Адбудуцца перамовы беларускай дэлегацыі з кіраўніцтвам Міністэрства культуры, інфармацыі, спорту і моладзевай палітыкі Кыргызскай Рэспублікі.

Урачыстае адкрыццё Дзён культуры правядуць у Кыргызскім нацыянальным ордэна У. І. Леніна акадэмічным тэатры оперы і балета імя Абдыласа Малдыбаева з удзелам Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, народнага артыста Беларусі Уладзіміра Громава, заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь Алёны Ланской, Жанет.

У кінатэатры “Манас” у Бішкеку пакажуць фільмы “Падрыў”, “Страла”, анімацыйныя стужкі “Зоркі сёмага неба”, “Тошка і яго сябры”.

На адмысловай выставе будуць прэзентаваны звычаі ажурнага ткацтва Гарадоцкага раёна і традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер’я.

Таксама запланаваны сустрэчы з кіраўнікамі вядучых тэатральна-відовішчных устаноў і ўстаноў адукацыі ў сферы культуры Кыргызстана.

Размаўляць праз творчасць і натхненне

Як прывабіць моладзь у сферу культуры?

Напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей, 31 мая, на базе Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў прайшло выязное пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры, прысвечанае пытанню рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі ў сферы культуры.

Анатолій Маркевіч знаёміцца з прэзентацыяй тэматычных пляцовак

Перад пачаткам пасяджэння ўдзельнікі калегіі ўсклалі кветкі да манумента на плошчы Славы, а таксама пабачылі прэзентацыю творчых калектываў Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, які разгарнуў на пешаходнай Ленінскай вуліцы "Тэрыторыю творчасці" — тэматычныя пляцоўкі, якія прадставілі творчы сімбіёз калектываў каледжа, дзіцячых школ мастацтваў і маладых выкладчыкаў — выпускнікоў каледжа. Агулам у мерапрыемстве былі задзейнічаныя каля 250 чалавек. Тут былі прадэманстраваныя ўсе кірункі працы творчай моладзі горада. Міністэрскую дэлегацыю чакала прэзентацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і дызайну, саломапляценне, кераміка, выцінанка, вышыўка і аб'ёмныя вырабы з паперы. Шырока было прадстаўленае акцёрскае мастацтва: мімы, клаўнада і жывыя фігуры. Ахвочыя маглі паўдзельнічаць у майстар-класах або папазіраваць юным мастакам.

НА ПРЫКЛАДАХ

Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў **Наталля Гохт** падкрэсліла, што гэта адзіная ў горадзе сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова ў сферы культуры, якая акумулявала тры навучальныя ўстановы і прайшла праз дзве рэарганізацыі: у 2017 годзе да яе быў далучаны Магілёўскі бібліятэчны каледж імя А. С. Пушкіна, у 2021-м — музычны каледж імя М. А. Рымскага-Корсакава. Сёння тут навучаецца больш за 920 чалавек, ёсць дзённае і завочнае аддзяленні, прадстаўленыя 11 спецыяльнасцей і 23 напрамкі. Падрыхтоўка праходзіць па ўсіх існуючых у сферы культуры напрамках — музычным, харэаграфічным, акцёрскім і мастацкім.

Пасля сканчэння каледжа дзеці паступаюць у Беларускі ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Акадэмію музыкі і Акадэмію мастацтваў. Магілёўскія выпускнікі працягваюць навучанне не толькі ў беларускіх ВНУ, але і ў расійскіх, удзельнічаюць у міжнародных конкурсах і фестывалях. Размяркоўваюць 100 працэнтаў выпускнікоў, патрэба ў спецыялістах перавышае іх колькасць, і гэта найлепшы доказ таго, што сфера культуры болей чым папулярная. На працягу некалькіх гадоў установа выконвае план прыёму, а па некаторых спецыяльнасцях конкурс даходзіць да 5-6 чалавек на месца. Як правіла, найбольшай папулярнасцю карыстаюцца такія напрамкі, як дызайн, акцёрскае мастацтва, мастацтва эстрады і спеваў. Пры размеркаванні вялікі попыт на рэжысёраў народных абрадаў і свят, акцёраў, настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў, а таксама выканаўцаў на фартэпіяна. Найбліжэйшым часам будзе разгледжаная таксама магчымасць навучання дызайну віртуальнага асяроддзя.

> У Магілёўскай вобласці вельмі цікавыя падыходы ў рабоце з моладдзю: ёсць добры досвед, які прымяняецца не толькі на тэрыторыі рэгіёна, а вядомы ў маштабах краіны.

ЗАРУКА ПОСПЕХУ

Як адзначыў **Анатолій Маркевіч**, выязная калегія Міністэрства культуры праводзіцца ў Магілёўскай вобласці не выпадкова, бо тут вельмі цікавыя падыходы ў рабоце з моладдзю: ёсць добры досвед, які прымяняецца не толькі на тэрыторыі рэгіёна, а вядомы ў маштабах краіны. Сённяшняя моладзь — гэта заўтрашнія кіраўнікі, тыя людзі, што будуць вырашаць масу пытанняў і праблем, якія дыктуе само жыццё. Мы зможам выхаваць падрастаючае пакаленне і закласці ў яго аснову праз традыцыі, вялікую гісторыю, разуменне сённяшняга дня. Важна прывучыць шанаваць тое, што маем, — цудоўную зямлю, сваю малую радзіму, а таксама выхаваць пачуцці любові, дабрыні і павагі да старэйшых.

Паводле слоў міністра, зроблена ўжо шмат, аднак засталіся і праблемныя ўчасткі ў рабоце, на якія трэба звярнуць пільную ўвагу, выбраць дакладныя і зразумелыя алгарытмы ўзаемадзеяння. Першае — гэта кадравая палітыка. Калі мы знайшлі ўмелых кіраўнікоў, сур'ёзна з імі працуем, не губляем з-пад увагі і правільна расстаўляем, то падрыхтаваныя спецыялісты немінуча становяцца зарукай поспеху. Калі толькі прамахнуліся ў гэтым пытанні — поспеху не відаць, таму што ад кіраўніка залежыць далейшы шлях развіцця любога калектыву і ўстановы.

Выхаваўчая праца стала другім напрамкам, на якім засяродзіў увагу міністр. Гэтай тэме трэба надаваць самую важную і сур'ёзную ўвагу, размаўляць з нашай моладдзю на зразумелай ім мове — праз творчасць і натхненне. Важна тлумачыць складаныя механізмы простай і зразумелай мовай для таго, каб хлопцы і дзяўчаты былі зарыентаваныя ў гэтым няпростым, бурлівым сучасным свеце, бо сёння мы бачым, наколькі паспяхова развіваецца наша краіна, аднак гэта не дадзенасць, а вельмі сур'ёзны пройдзены шлях, і мы павінны пра гэта расказваць і казаць, што за ўсімі дасягненнямі стаіць каласальная праца нашых людзей, жыхароў Беларусі. Гэтыя пытанні вельмі важныя не толькі для моладзі, але і для ўсяго нашага грамадства, каб мы маглі радавацца кожнаму дню на цудоўнай беларускай зямлі і ўпэўнена глядзець у будучыню.

ЁСЦЬ ПЕРСПЕКТЫВЫ!

З асноўным дакладам на пасяджэнні калегіі выступіла начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры **Марына Юркевіч**. Яна адзначыла, што ва ўстановах адукацыі распачатая падрыхтоўка па шэрагу новых запатрабаваных спецыяльнасцей. Расце таксама колькасць конкурсаў, пераможцы якіх атрымліваюць права на паступленне ва ўстановы вышэйшай адукацыі без уступных выпрабаванняў. Не спыняецца і даследчая работа — установамі адукацыі ў сферы культуры праведзеныя шэсць міжнародных навуковых канферэнцый, на якіх былі агучаныя больш за семсот дакладаў. Вялікая ўвага надаецца таксама патрыятычнаму выхаванню моладзі і працаўладкаванню, летась амаль паўтары тысячы выпускнікоў, якія падлягалі размеркаванню, атрымалі свае першыя працоўныя месцы.

Акрамя таго, на калегіі выступілі начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч, прарэктар па выхаваўчай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Юрый Караеў і дырэктар інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандр Філіпаў. У дыскусіі ўдзельнікі калегіі адзначылі неабходнасць удасканалення заканадаўства аб адукацыі ў дачыненні да сферы культуры і працы па мэтавай падрыхтоўцы кадраў для ўстаноў культуры ў рэгіёнах.

Антон РУДАК
Фота аўтара і з інтэрнэту

Выступы на "Тэрыторыі творчасці"

На сувязі!

Наколькі важна камунікаваць з публікай у Сеціве, музейшчыкі канчаткова ўсвядомілі, напэўна, падчас пандэміі. Пагроза сышла, але адмыслоўцы не кінулі віртуальныя праекты. Чаму і як сёння навуковыя супрацоўнікі выкарыстоўваюць інтэрнэт?

У прыхільнікаў праекта "Стары дом" ёсць магчымасць "развіртуаліцца" і пачуць жывы аповед Іны Аўсейчык на аўтарскіх шпацырах-экскурсіях.

Ахоп праекта "Два раёны — адна гісторыя" ў сацыяльных сетках з лютага склаў больш за 30 тыс. праглядаў.

ГІСТАРЫЧНЫЯ МАСТЫ

Амаль 400 кіламетраў раздзяляюць Івацэвічы і Быхаў. Аднак у мінуўшчыне аддаленых гарадоў знойдзецца больш агульнага, чым мяркуе абывацель. Гэта даказвае праект "Два раёны — адна гісторыя". Супрацоўнікі Быхаўскага і Івацэвіцкага гісторыка-краязнаўчых музеяў шукаюць пункты судакранання ў летапісах краёў, ладзяць сумесныя даследаванні і сінхронна публікуюць матэрыялы на афіцыйных старонках устаноў у сацыяльных сетках, а таксама на партале "Музеі Беларусі". Прачытаць нататкі можна па хэштэгах #двараёна_однаистория і #быхов_ивацевичи.

У аснове кожнага запісу — аповед пра каштоўныя прадметы з фондаў. Напрыклад, інтэрнэт-карыстальнікаў знаёмяць са старадаўнімі геаграфічнымі картамі, з палеанталагічнымі і археалагічнымі знаходкамі, друкаванымі выданнямі, фотаздымкамі, побытавымі рэчамі, калекцыяй нумізматыкі. Ахвотныя даведваюцца, калі і дзе ўпершыню згадваюцца населеныя пункты, што сімвалізуюць іх гербы, хто з вядомых асоб звязаны з гэтымі куточкамі краіны.

— Развіццё тэхналогій змяніла мадэль узаемадзеяння музеяў не толькі з аўдыторыяй, але і паміж сабой. Стасункі пашырыліся за кошт віртуалізацыі і дыстанцыйнага доступу. І афіцыйныя суполкі ўстаноў у сацыяльных сетках цяпер — асноўны пасярэднік у перадачы інфармацыі. Сумесная работа музеяў аднаго профілю з розных геаграфічных пунктаў дазваляе выклікаць большую цікавасць аўдыторыі і прадэманстраваць інавацыйныя формы падачы матэрыялу, — раскрывае актуальнасць ініцыятывы навуковы супрацоўнік Быхаўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Яўгенія Федарчук.

Паводле канцэпцыі, адмыслоўцы мусяць выйсці за межы віртуальнай прасторы. Прадстаўнікі быхаўскага музея ўжо завіталі на навукова-практычную канферэнцыю "Івацэвіцкія краязнаўчыя чытанні". Падчас мерапрыемства падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. У снежні ж чакаюць калег з заходняга рэгіёна на падобным форуме, што адбудзецца ў Быхаве 13-ы раз, з візітам у адказ. Новай прыступкай могуць стаць абменныя майстар-класы і выставы, сумесныя канферэнцыі і семінары, выданне матэрыялаў агульных даследаванняў. Вядома, падзеі ў афлайн-фармаце патрабуюць немалых выдаткаў, але дырэктар Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Сяргей Жыжыян запэўнівае: патэнцыял Сеціва яшчэ не вычарпаны, а таму супольная праца не спыніцца.

Уладзімір Садзін



Дом Дарэўскага — адзін з герояў праекта "Стары дом"

Ігар Ермакоў. "Старажытны Слуцк"

ТАЯМНІЦЫ СТАРЫХ ДАМОЎ

Куды ў сваім горадзе звадзіць гасцей? На розум звычайна прыходзяць славутасці з паштовак і магнітаў. Але ж і непрыкметныя на першы погляд аб'екты могуць уразіць — варта толькі праявіць дапытлівасць. Завітваеш так з году ў год у флюараграфічны кабінет і нават не здагадваешся, што ў гэтым памяшканні і век таму працавалі медыкі. За свежай тынкоўкай і новымі шыльдамі схавана аўтэнтычная прыгажосць, а час знішчыў ці не ўсё памяткі пра былых гаспадароў і наведвальнікаў. Паспрабуй дакапайся.

Бабруйчанам пашанцавала. Раскрыць таямніцы знаёмых кожнаму будынкаў узялася супрацоўніца мясцовага краязнаўчага музея Іна Аўсейчык. Прыклад з флюараграфічным кабінетам з яе досведу. Даследчыца аднавіла гісторыю дома па вуліцы Камсамольскай і біяграфію яго ўладальніка. З росшукаў стала вядома, што ў будынку размяшчаліся кватэра і кабінет для прыёму зубнога доктара Гецава, а па суседстве працавала гарадская зубаўрачэбная амбулаторыя. Удалося нават высветліць, які лёс напаткаў нашчадкаў адмыслоўца. І падобныя цікавінкамі спадарыня Іна дапоўніла "пашпарты" больш як дзясятка дамоў канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Усяго камяніц таго перыяду захавалася звыш сотні. І разведка працягваецца.

Знаходкамі навуковая супрацоўніца дзеліцца ў адмысловай рубрыцы "Стары дом" на сайце музея і на старонках у сацыяльных сетках. Такім чынам, кожны падпісчык можа самастойна ператварыць звычайны шпацыр па звыклых кварталах у захапляльную экскурсію. Мяркуючы па каментарыях, анлайн-праект зацікавіў і замежных карыстальнікаў, якія не забываюцца на бабруйскія карані.

Захапляльныя нататкі з ілюстрацыямі — толькі дробка ўсёй працы. За бачнай часткай праекта стаяць тытанічныя высілкі. У распараджэнні музейшчыкаў было надзвычай мала інфармацыі пра дарэвалюцыйныя дамы. Вядома, ініцыятыва стартавала з пошукаў у Занальным дзяржаўным архіве ў Бабруйску і Нацыянальным гістарычным архіве, давялося пакорпацца і ў перыядычным друку пачатку мінулага стагоддзя. Так з газетных аб'яў, з купчых крэпасцей, з дакументаў, ускосна звязаных з будынкамі, пацыху вымалёўвалася гісторыя кожнага помніка.

Дарэчы, у прыхільнікаў анлайн-праекта "Стары дом" ёсць магчымасць "развіртуаліцца" і пачуць жывы аповед Іны Аўсейчык. Колькі гадоў таму Бабруйскі краязнаўчы музей стаўладзіцьаўтарскія шпацыры-экскурсіі: "Легенды і былі Інвалiднай вуліцы", "Летнія забавы ў Бабруйску пачатку XX стагоддзя", "Я люблю гэты горад, дзе жылі бабруйскія Ротшыльды" ды іншыя.

ВІРТУАЛЬНЫ АГЛЯД

Георгій Скрыпнічэнка, Уладзімір і Міхаіл Басалыгі, Уладзімір Акулаў — нямала таленавітых мастакоў звязана са Слуцкам. Сёлета, калі раённы цэнтр атрымаў статус культурнай сталіцы Беларусі, мясцовы краязнаўчы музей распачаў віртуальны праект "ART-прастора Случчыны". Ён знаёміць карыстальнікаў сацыяльных сетак з творамі тутэйшых жывапісцаў і графікаў у калекцыі ўстановы.

Фотарэпрадукцыі дапоўнены кароткімі біяграфічнымі даведкамі і лаканічнымі мастацтвазнаўчымі каментарыямі. Відавочна, музейшчыкі ўзялі пад увагу звычкі інтэрнэт-аўдыторыі і не сталі загружаць падпісчыкаў вялізнымі аб'ёмамі — нататкі адолее нават дзіця. Але канцэнтрацыя цікавых фактаў такая, што не засумуюць і абазнаныя.

Адкрыла арт-праект карціна "Слуцк. Куток старога горада" — адно з самых даўніх палотнаў Уладзіміра Садзіна. Сімвалічна, што першы матэрыял прысвечаны гэтай асобе. Ганаровы грамадзянін раёна не толькі стварыў больш за тысячу работ, але і выхаваў плеяду самабытных майстроў. Згаданыя раней мастакі ды яшчэ дзясяткі аўтараў вучыліся чараваць пэндзлем у выяўленчай студыі Садзіна пры Доме піянераў і школьнікаў.

Віртуальная галерэя сталася сапраўдным парталам у мінуўшчыну. Разам з творцамі розных пакаленняў глядач вандруе па эпохах. Ігар Ермакоў пераносіць публіку ў сярэдневяковы горад, а Сцяпан Скорабагатаў паказвае краявіды пачатку XX стагоддзя. Многія будынкі, адлюстраваныя на карцінах, даўно зніклі або выкарыстоўваюцца па новым прызначэнні. Таму старажылам праект навее цёплыя ўспаміны, а маладым случчакам і гасцям культурнай сталіцы падорыць унікальныя адкрыцці.

Данііл ШЭЙКА

Расцвітай, кветка сяброўства!

Новай яркай старонкай у кнізе сяброўства Беларусі і Кітая стаў Тыдзень Магілёўскай вобласці ў горадзе Цяньцзінь. Беларуская творчая дэлегацыя гасцявала ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы з 16 па 19 мая. Сваімі ўражаннямі ад паездкі падзялілася дырэктар Магілёўскай абласной філармоніі Святлана Яфімук.

"Такія мерапрыемствы неабходныя для замацавання сяброўства, развіцця супрацоўніцтва, глыбокага разумення адно аднаго, умення знаходзіць кропкі судакранання".

— Святлана Юр'еўна, гэта ваш першы візіт у КНР?

— У Кітай творчыя дэлегацыі філармоніі запрашаліся і раней, але ў горадзе Цяньцзінь мы былі ўпершыню. Нас сустрэлі вельмі ўрачыста, з вялікай цікаўнасцю. Мясцовыя жыхары ахінулі нас гасціннасцю, мы былі вельмі ўражаныя той атмасферай, якая панавала наўкол. Гэта вельмі прыгожы горад, у якім арганічна спалучаюцца даўнія архітэктурныя формы і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Людзі — добразычлівыя, натхнёныя і працавітыя. Але больш за ўсё нас захапіла знаёмства з кітайскай традыцыйнай культурай. Усё — ад нацыянальных строяў, страў, архітэктуры да абсалютна непаўторнага гучання кітайскіх народных інструментаў — стала для нас сапраўдным адкрыццём. Мы зразумелі, наколькі ўнікальная багатая шматвекавая культура Кітая.

— Што было ў праграме візіту?

— Праграма Тыдня Магілёўскай вобласці ў горадзе Цяньцзінь была вельмі насычаная, у тым ліку ў яе ўваходзілі вялікі канцэрт творчых калектываў і круглы стол.

— Якія тэмы абмяркоўваліся?

— Праблема месца нацыянальнай культурнай спадчыны ў сучаснай глабальнай творчай і інфармацыйнай прасторы, магчыма, адна з самых вострых, таму заяўленая тэма круглага стала — "Культурная спадчына ў прафесійным музычным мастацтве" — гучала вельмі актуальна.

У круглым стале ўдзельнічалі знешні выкладчык кафедры этнічнай вакальнай музыкі Цяньцзіньскай кансерваторыі, маладое сапрана Пекінскага тэатра оперы і балета У Мэнсюэ, выкладчык аркестравага аддзялення кансерваторыі, малады скрыпач Лю Фанглей, выкладчык кансерваторыі, доктар філасофіі Кітайскай акадэміі мастацтваў Чэн Інчжу, дацэнт кафедры народнай музыкі кансерваторыі, намеснік генеральнага сакратара Жуанскага камітэта Кітайскага нацыянальнага таварыства аркестравай музыкі Шэнь Цін, дацэнт суона кафедры народнай музыкі кансерваторыі, намеснік дырэктара цэнтра выканальніцкіх майстэрстваў Ван Чжаньчжан.

Кітайскія калегі пазнаёмілі нас са сваімі традыцыйнымі музычнымі інструментамі. Вельмі ўразіла гучанне гуцынь, шырокія магчымасці якога прадэманстравала Сунь Інсяо — выкладчыца Цяньцзіньскай кансерваторыі, выканаўчы дырэктар Кітайскай Асацыяцыі Цынь. Сунь Інсяо — шматразовая лаўрэатка прэстыжных нацыянальных музычных конкурсаў Кітая, артыстка, запатрабаваная на тэлебачанні, у канцэртах на сваёй радзіме і за мяжой, мае два сольныя альбомы "Юань Інь. Юань Інь" і "Позірк. Думка. Маньён", запісвае музыку для кінастужак і тэлепраектаў, сярод якіх такія цудоўныя карціны, як "Цень", "Саюз ваенных дывізій", "Вецер паднімаецца з Лунсі".

Нас заваражыла магічнае гучанне яшчэ аднаго нацыянальнага кітайскага інструмента — эрху. Яго прадставіў віцэ-прэзідэнт Асацыяцыі кітайскіх музыкантаў Нацыянальнага таварыства смычковай і струннай музыкі, намеснік старшыні прафесійнага камітэта "Хуцін" Кітайскага нацыянальнага таварыства аркестравай музыкі, загадчык кафедры народнай музыкі Цяньцзіньскай кансерваторыі Чэнь Цзюнь. Гэты знакаміты майстар ігры на эрху штогод удзельнічае ў больш чым 60 канцэртах па ўсім свеце, супрацоўнічае з кітайскімі і замежнымі кінарэжысёрамі, у 2001-м атрымаў званне "Лепшы акцёр" па версіі Шанхайскай асацыяцыі кінакрытыкаў за ўдзел у кінастужцы "Лю Цяньхуа".

Досвед кітайскіх калег, якім яны падзяліліся падчас круглага стала, аказаўся для нас цікавым і карысным: магчыма, некаторыя ідэі будуць рэалізаваныя на практыцы і ў дзейнасці філармоніі.

— З чым вы пазнаёмілі кітайскіх калег?

— Мы распавядалі пра дзейнасць нашай установы, прафесійных калектываў і артыстаў, якімі вельмі ганарымся, а таксама пра беларускі традыцыйны народны строй, зараджэнне і станаўленне беларускага музычнага фальклору. Размаўлялі пра тое, як не згубіць нацыянальную ідэнтычнасць у сучасным свеце і застацца пры гэтым адкрытымі для дыялогу ды ўзаемнага культурнага і духоўнага ўзбагачэння. Таксама мы расказалі пра маштабныя праекты Магілёўшчыны, такія як Міжнародны музычны фестываль "Залаты шлягер", Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў "Анімаёўка", Міжнародны тэатральны форум "М@рт.Кантакт", Форум дырыжораў. Кітайскіх калег вельмі зацікавіла вялікае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"), якое праводзіцца кожны год на Шклоўшчыне, — свята росквіту сілы, сонца і беларускай нацыянальнай культуры.

— Раскажыце пра канцэрт на сцэне Цяньцзіньскай кансерваторыі.

— Канцэрт "Расцвітай, кветка сяброўства!" стаў для нас сапраўдным падарункам. Артысты Магілёўскай абласной філармоніі — вакальны ансамбль "Весялуха", саліст-інструменталіст, вядучы майстар сцэны Пётр Войчанка — выступалі на адной сцэне з кітайскімі музыкантамі. Нашы артысты прадставілі сучасныя апрацоўкі вядомых беларускіх народных песень і найгрышаў, песні сучасных беларускіх аўтараў. Гледачы з энтузіязмам сустрэлі песню на кітайскай мове ў выкананні ансамбля "Весялуха". Гэта песня — прысвячэнне радзіме, якая ў кожнага з нас — адна, непаўторная і самая любімая.

Мы ўбачылі, якія мы розныя, але як многа ў нас агульнага: беражлівае стаўленне да нацыянальнай культурнай спадчыны і гонар за яе, а таксама вялікая любоў да радзімы, музыкі, гледачоў, жаданне зрабіць свет лепшым. У гэтым і ёсць прызначэнне мастацтва: ствараць свята, несці людзям святло і дабрыню. І няважна, што мы граем на розных музычных інструментах, спяваем на розных мовах. Творчасць, музыка — мовы, якім не трэба перакладчык. Гэта нітачкі ад сэрца да сэрца. Усе прысутныя гэта разумелі. Нашы народныя мелодыі аказаліся сугучныя кітайскім сябрам. Магілёўскіх артыстаў сустракалі шчырымі апладысментамі, гэта было вельмі прыемна і радасна.

Хочацца падзякаваць за цудоўны, насычаны час, праведзены ў горадзе Цяньцзінь. Такія мерапрыемствы вельмі неабходныя для замацавання сяброўства, развіцця супрацоўніцтва, больш глыбокага разумення адно аднаго, умення знаходзіць кропкі судакранання. Узаемаабмен досведам, як прафесійным, так і арганізацыйным, заўсёды важны. Цяпер у нас многа творчых планаў. Спадзяюся, што мы будзем сустракацца часцей, адкрываць адно для аднаго новыя грані нацыянальнай культуры, прымаць на беларускай зямлі артыстаў з Кітая, каб нашы гледачы і слухачы таксама маглі пазнаёміцца з самабытнай, яркай, багатай культурай сяброў.

Алёна ПРУДНІКАВА

Фота з архіва Магілёўскай абласной філармоніі

Саўндтрэкі сусветнага кіно прагучаць на канцэрце скрыпічнай музыкі ў Гродне 25 чэрвеня.

Арт-рынак поруч з кірмашом

Мастацтва сёння: новыя формы выказвання ці выклікі традыцыям?

Якія існуюць тэндэнцыі ў сучасным беларускім мастацтве? Хтосьці лічыць яго загадкавым і дзіўным. Іншыя сцвярджаюць, быццам яго ўвогуле няма. Але ж ёсць маладыя творцы! Ці ведаюць пра іх суайчыннікі і што думаюць наконт здабыткаў сучасных аўтараў? Вось некалькі меркаванняў на гэты конт.

ІРЫНА, псіхолаг:

— Па маіх назіраннях, мастацтва ў нас ёсць. Праблема ў тым, што павінна існаваць інфраструктура — своеасаблівы пасярэднік паміж ім і соцыумам. Папершае, гэта рынак, які ўяўляе сабой складаную сукупнасць працэсаў і з'яў. Па-другое, неабходны амартызатары паміж жорсткімі законамі рынку і самім мастацтвам, далікатным і адчувальным. Такую ролю адыгрываюць дзяржаўныя інстытуты — музеі, цэнтры, фонды. Па-трэцяе, тое прафесійная супольнасць — крытыкі, эксперты, журналісты. Па-чацвёртае, адукацыя. І гэтак далей...

Усё пералічанае, разам узятае, дазваляе простаму гледачу даведацца аб існаванні сучаснага мастацтва і сфарміраваць аб ім меркаванне. Неабавязкова, дарэчы, дадатнае.

У нас газеты і парталы з задавальненнем перадрукоўваюць прэс-рэлізы пра набыццё поп-зоркай С. новых штаноў, а крытыкі і аналітыкі няма. Ды і пляцовак для іх няшмат. З адукацыяй бяда... І ў гэтых умовах наўрад можна дзівіцца, што айчынны арт-рынак застаецца кірмашом.

Узнікае слушнае пытанне: а што ж рабіць? Ды хоць штонебудзь, але рабіць. Баюся, пакуль у нас не з'явяцца людзі, гатовыя працаваць за так, з-за любові да мастацтва, не разлічваючы на эфектны вынік, агульная карціна не зменіцца.

І яшчэ. Сучаснае мастацтва ў нас мала хто ведае, але многія асуджаюць. Гэта яшчэ адна тутэйшая асаблівасць. Навошта ганьбіць тое, у чым не разбіраешся і разбірацца не жадаеш? Не жадай і далей — але моўчкі.

РАМАН, бізнесмен:

— Сучаснаму мастацтву Беларусі ўласцівы эксперыменты і пошук новых формаў, але пры гэтым яно развіваецца ў кантэксце нацыянальнай культуры. Айчынная арт-прастора сёння — з'ява, апісаць якую, не закрануўшы нічыё самалюбства, далёка не проста. І справа тут нават не ў тым, што выставачных зал у нас мала... На жаль, і ў Мінску большасць вернісажаў так і не робіцца прыкметнымі падзеямі. Звычайная сітуацыя: у самым цэнтры горада экспануецца жывапіс, а людзі праходзяць міма.

Такога жывапісу асабліва шмат сёння, калі камунікацыі з тымі, для каго ён ствараецца, няма. Калі ўвесь сучасны мастацкі працэс зводзіцца да лагодных інтэрв'ю з нагоды юбілеяў і не менш лагодных водгукаў на чарговую выставу. Сур'ёзна экспазіцыі амаль нідзе не абмяркоўваюць, прафесійна пра творчасць не спрачаюцца... Ды што, уласна, абмяркоўваць, калі спрачацца няма пра што? Большая частка нашай публікі мастацтва не бачыць, не ведае, а магчыма, не чакае.

Я цікаўлюся фатаграфіяй. І знайсці сапраўды вартыя работы вельмі складана. Здымкі некаторых сучасных майстроў вылучаюцца выразнай эстэтыкай, адсутнасцю штампаў у кампазіцыйным і вобразным мысленні. Сярод аўтараў старэйшага і сярэдняга пакаленняў хацеў бы назваць Міхаіла Баразну, Яўгена Казюлю, Анатоля Клешчука.



ВАЛЕРЫЯ, дызайнер:

— Для сённяшняга сусветнага мастацтва характэрная разнастайнасць візуальных эксперыментаў. На гэтым фоне беларускае выглядае дастаткова традыцыйна. Аднак нацыянальная творчая школа не імкнецца да адзінай акадэмічнай рэалізацыі. Графіка, жывапіс, фатаграфія, іншыя віды выяўленчага мастацтва развіваюцца ў рэчышчы сучасных візуальных тэндэнцый. Назіраецца змешванне і ўзаемадзеянне стыляў, уласцівае Еўропе.

У айчынным мастацтве апошніх гадоў бачныя размаітасць і філасофскае абагульненне вобразаў. Значна актывізавалася выставачная дзейнасць, праводзяцца міжнародныя пленэры, фестывалі і экспазіцыйныя праекты, аўтары актыўна шукаюць свой кірунак сярод міжнародных тэндэнцый. З'явілася новае пакаленне беларускіх творцаў, здольных да неперадузятага ўспрымання самых разнастайных плыняў у сусветным мастацтве.

Ганна САКАЛОВА

Даніна павагі

З мэтай увекавечання памяці класіка беларускай літаратуры, выбітнага паэта, празаіка, публіцыста, мовазнаўцы Змітрака Бядулі абвешчаны збор сродкаў на стварэнне надмагільнага манумента пісьменніку.

Эскіз распрацаваны вядомым айчынным скульптарам **Сяргеем Гумілеўскім**. Для вытворчасці і ўстаноўкі помніка неабходна сабраць суму ў памеры 12,5 тыс. беларускіх рублёў.

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры звярнуўся да прадпрыемстваў, арганізацый, зацікаўленых грамадзян з просьбай прыняць удзел у дабрачынным зборы сродкаў і зрабіць пасільны грашовы ўнёсак.

Справа ў тым, што на пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 3 лістапада 1941 года, Змітрок Бядуля (сапр. Самуіл Яфімавіч Плаўнік) памёр у эвакуацыі каля горада Уральска (Казахстан) і быў пахаваны на мясцовых могілках. Намаганнямі нашай дзяржавы і грамадскасці, насуперак шматлікім складанасцям, была зладжана работа па вяртанні астанкаў паэта на Бацькаўшчыну. Пры арганізацыйнай падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкама, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і прыхільнікаў пісьменніцкага таленту 3 лістапада 2020 года творцу перапахавалі на Усходніх могілках у Мінску...

Музей будзе ўдзячны за любую фінансавую дапамогу праекту па ўвекавечанні памяці Змітрака Бядулі, бо кожнае ахвяраванне, незалежна ад памеру, — даніна павагі слаўнаму сыну беларускай зямлі, які шмат зрабіў для развіцця літаратуры.

Разліковы рахунак
у беларускіх рублях:
BY15AKBB36429000005530000000
у ААТ "ААБ «Беларусбанк»". БІК:
AKBBBY2X,
УНП: 190269032.
Атрымальнік: Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.
Код прызначэння плацяжу: 999.

Міжнародны фестываль "Звіняць цымбалы і гармонік" праходзіць у Паставах.

"Праспект побач з ГУМам"

"Праспект каля магазіна «Лакамка»"

"Траецкае прадмесце"

Запрашэнне на праменад

Шосты раз галерэя "Панарама" Нацыянальнай бібліятэкі далучылася да фестывалю мастацтва "Арт-Мінск". Сёлета на пляцоўцы, адкуль як на далоні бачныя сталічныя прасторы, выставілі гарадскія пейзажы Маргарыты Маніс. Такім чынам, можна ў розных маштабах і ракурсах разгледзець вядомыя краявіды.

Нарадзілася аўтарка ў Чэрвені, пазней перабралася ў Слонім, дзе пайшла ў школу. І толькі ў 14 гадоў пазнаёмілася з Мінскам. Тут скончыла мастацкае вучылішча імя Глебава. З той вучнёўскай пары і палюбіла куточкі, якія сёння адбіваюцца на палотнах. На дзіва, сталіца адразу прыняла дзяўчыну і стала падказваць сюжэты. "Варта толькі затрымаць увагу на хвілінку, і вуліцы пачынаюць адкрываць свае таямніцы, зіхацець рознымі гранямі", — дзеліцца Маргарыта Маніс. Па яе ўспамінах, чароўныя віды горада нібыта самі праявіліся на карцінах. Настолькі натуральна і нават неўсвядомлена жывапісец выйшла на сваю магістральную тэму. Безумоўна, попытам карыстающца сакавітыя нацюрморты і абстрактныя кампазіцыі мастачкі: работы разышліся па прыватных калекцыях больш як 20 краін. Але ж найярчэй самабытнасць творцы адбілася ў мінскіх пейзажах.

Плошча Свабоды, парк імя Максіма Горкага, Траецкае прадмесце, бульвар на вуліцы Леніна — Маргарыта малюе пазнавальныя куткі. Пры гэтым нярэдка выбірае нязвыклыя ракурсы і так пазбягае пустога тыражавання паштовачных кадраў. Аўтарка нават не баіцца пасунуць архітэктурныя візітоўкі горада на другі план. Напрыклад, паказваючы скрыжаванне вуліц Алаізы Пашкевіч і Максіма Багдановіча, мастачка нібы маскіруе бялюткія аб'ёмы Вялікага тэатра, каб глядач адкрываў вядомыя элементы паступова, спрабаваў вызначыць каардынаты не толькі па дамінанце.

Нароўні з Прывакзальнай плошчай і праспектам Незалежнасці творца надае ўвагу зацішным лакацыям. Побач з дамамі, што многія дзесяцігоддзі ўпрыгожваюць нашы вуліцы, узнікаюць сучасныя шкляныя гмахі. Багата аздобленыя пабудовы красуюцца ў залацістым святле ліхтароў, віднеюцца за дымкай і адлюстроўваюцца ў мокрым асфальце яркія шыльды і габарытныя агні машын, ззяюць сонцам восеньскія паркі. І ў кожным палатне адчувальнае шчырае замілаванне ды ўнутраная цікамірнасць.

Данііл ШЭЙКА

"Аліса" пасталела. А ці вырасла?

У рэпертуары Тэатра-студыі кінаакцёра з'явілася яшчэ адна "Аліса" — тая, што "ў Краіне цудаў". "У Залюстроўі" — ужо была. І трымалася там шмат гадоў запар.

Творы Льюіса Кэрала даюць неверагодную прастору дзіцячай фантазіі. А разам з тым і фантазіі пастаноўшчыкаў. Цікавасць да прыдуманых англічанінам прыгод Алісы вымяраецца безліччу ўвасабленняў па ўсім свеце ў самых розных відах мастацтва, уключаючы балет. Таму факт чарговай "прапіскі" гераіні на сцэне Тэатра-студыі кінаакцёра — зусім не сенсацыя. Хутчэй чаканая заканамернасць. Прычым у найлепшых традыцыях самога пісьменніка, у казках якога многае адбываецца наадварот, адпавядаючы эстэтыцы абсурду.

Вось і ў нас "Аліса ў Залюстроўі" стала ў тэатры "першай серыяй" гісторыі. А першая кніга — "Аліса ў Краіне цудаў" — другой. Больш за тое, пастаноўшчыкі вырашылі зрабіць гераіню старэйшай: у новым спектаклі яна не маленькае дзяўчо, а падлетак, без пяці хвілін дзяўчына. І нават згадвае ў адной са сцэн былое падарожжа ў Залюстроўе. Пераемнасць бачыцца і ў тым, што прэм'еру рыхтавала ранейшая каманда: рэжысёр Алег Кірэеў, мастак Лідзія Малашэнка, кампазітар Валерый Воранаў, харэограф Наталля Фурман.

Спектакль вабіць найперш яркімі строямі, прыдумкамі сцэнаграфіі. Ах, якія прыгожыя кубачкі ездзяць па тэатральных падмостках! Аліса, як памятаеце, рэзка змяншаецца — і можа ў адным з тых кубачкаў схавацца. А ўборы ў птушак! А аблічча Вусеня! Яго выкатваюць на сцэну, і ўжо сам касцюм выклікае авацыі. Дарэчы, пад маскай гэтага героя хаваецца заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Кашпераў**. Ён праводзіць ролю, пазбаўленую руху, бліскуча — адным голасам, але ж як! І таксама зрывае апладысменты. У спектаклі ўвогуле шмат рэквізіту, уласцівага тэатру лялек. Чэшырскі Кот складаецца з дзвюх самастойных частак — яго ўвасабляюць два акцёры. Сякера, якую трымае Кат, ператвараецца ў электрагітару. Доўгія пальчаткі на руках артыстаў — у фламінга. Адзін з элементаў каралеўскай сукенкі — у клавесін. Задзейнічаны і экран з відэакантэнтам, што значна спрашчае іншыя дзівосы-чараўніцтвы.

А які цуд — музыка! Разнажанравая, рознастылёвая, яна таксама ўвесь час перажывае вынаходлівыя трансфармацыі, ствараючы гукавое аблічча персанажаў. Мышка? Рэп. Вусень? Оперныя спевы басам-барытонам. Чэшырскі Кот? Блюз. Тройчы згадваецца "Філін" — толькі не птушка, а знакамітая мелодыя — Feeling. Што ні кажыце, а кампазітар і мастачка ў сваіх прыдумках выступілі годнымі сябрамі-партнёрамі Кэрала.

І ўсё б добра, ды... нічога не зразумела. Артысты ў большасці не размаўляюць, а крычаць. Кожнай з неверагодных падзей рэжысёр імкнецца даць нейкае рэальнае тлумачэнне — і тым самым псуе атмасферу фантасмагорыі, парушае законы абсурдызму, без якіх страчваецца ўвесь смак гульні ў самым яе шырокім філасофскім разуменні. А без гэтага — пра што ўвесь аповед? Няўжо пра недарэчны сон? На самай жа справе — пра гульні розуму.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Тацяны МАТУСЕВІЧ

Сцэны са спектакля

Пажытак для розуму

"У цябе колькі
сотак бульбы, га?
Я цябе пытаю!
Колькі?
Не ведаеш!
А ў маёй
маці — 20!
Я яе штогод
вось гэтымі
рукамі саджаю
і выкопваю,
каб у маці
заусёды бульба
была!"

"Я ў лазню
схадзіў, памыўся.
Надзеў усё
новае, чыстае.
Фуфаечка —
новая,
без нумара.
Шапка — новая.
Маечка — новая.
Я ж да людзей
іду…"

Пра існаванне ў Мінску Камернага драматычнага тэатра я дазнаўся, толькі калі атрымаў прапанову яго наведаць. Нагода — прэм'ера спектакля "Ехай!". Імя драматурга Ніны Садур на афішы таксама мне ні аб чым не гаварыла. Ну не тэатрал, што тут зробіш! А творчасць Ніны Садур, між тым, як пасля высветліў, пазіцыянуецца як "не для водаправодчыкаў". І вось мы ў тэатры...

Пачынаецца ён не як усе звычайныя, "з вешалкі", а проста з фае. Спектакль ішоў ужо там, да першага званка. Дзіўнавата і не вельмі пераканаўча. Вершы з прэтэнзіяй на глыбіню з вуснаў вясковага пастушка гучаць нібы жыццёва, але занудліва. Маралізатарства "за ўсё добрае" і захапленне лужкамі-палямі не адпавядаюць агульнаму пасылу марнасці быцця і расчараванасці. Але ж сама задума цікавая.

Стаім, чакаем запрашэння ў залу. І тут прытупаў бадзяга! Таксама пастаяў. Усе меркавалі, што ён штосьці скажа ці зробіць. А ён проста стаяў. Як усе. І маўчаў. Як усе. Бадзяга. Натуральны.

Першы акт доўжыўся роўна 30 хвілін. Жонка здзіўлена запытала: "Гэта што, усё?" Добра, зазірнём у буфет. Прыйшлі. Аказалася, што там дзея працягваецца. Абсалютна лагічна і пераканаўча. П'яніца за цэнтральным столікам быў такі шумны — я нават задумаўся: што з ім рабіць? Замовіць гарэлкі і падсесці пагаварыць альбо зарадзіць у скіўцу, бо задзёўб? Але маю ўвагу адцягнула нахабная дзеўка, што лаялася з барменам, які забыўся наліць ёй малака туды, дзе яго не павінна быць: "Ты абяцаў! І я хачу атрымаць сваё малако!" Закарцела пажартаваць. Але побач была жонка, прамаўчаў.

Селі, п'ём каву. Думаю: навошта мне гэта ўсё? Увесь гэты спектакль — ад фае да буфета. Навошта гэта ўсё прыстойным, інтэлігентным людзям, якія прыйшлі ў тэатр на прэм'еру? Не ў шынок, не да сваяка на "хіміі", а ў тэатр? Ліхія 1990-я бачыліся прыкольнымі тады, калі нам было па 20. Мы, маладыя і дужыя, маглі вытрымаць усё. Але цяпер навошта гэта нам, навошта нашым дзецям гэтая цемрадзь? За такімі думкамі мяне заспела другая дзея...

А вось у ёй пачаліся зусім іншыя разважанні. Драматургічная спружына нарэшце выпрасталася, выціснуўшы з галавы гледача ўсё другаснае. Стала зразумела, навошта нам "гэта ўсё". Каб не расслабляліся! Каб слухалі маці і паважалі яе! Няма ў свеце нічога, што магло б параўнацца з матчынай любоўю. Яна дае простай вясковай бабулі мудрасць і цярпенне, якія перамагаюць усе нягоды, ратуюць нас ад роспачы і расчаравання ў самыя невыносныя моманты жыцця.

Але ж "Ехай!" мае шмат сэнсавых пластоў. Напісаная ў 1984-м п'еса сёння гучыць актуальна, як і належыць сапраўднай класіцы. А ўвасоблены Камерным драматычным тэатрам вобраз жанчыны-маці пашыраецца да вобразаў Радзімы і нават Зямлі-матухны, аб'ядноўваючы трох нібыта выпадковых чужых людзей у сям'ю і, больш за тое, выяўляючы чалавецтва.

І за бытавым па сутнасці канфліктам мы знаходзім экзістэнцыяльную драму. Ідэя п'есы — асоба асуджана на расчараванне. А выратаваць яе можа толькі любоў. Не каханне, але матчына любоў! Гэта выдатна зразумела і паказала рэжысёр Тамара Суфрункова, для якой спектакль стаў тэатральным дэбютам, і бліскуча адлюстравалі акцёры Камернага драматычнага. Брава!

Аб працы артыстаў, што выканалі галоўныя ролі, трэба сказаць асобна. Тацціяна Андросава проста геніяльна сыграла Бабку. Гэта найлепшае акцёрскае ўвасабленне вобраза жанчыны-маці, якое я калі-небудзь бачыў. Дакладна перададзеныя самыя дробныя рысы — ад старэчай няўпэўненай мітуслівасці да дрыготкіх сухенькіх ручак. Дарэчы, пра няўпэўненую мітуслівасць... Гэта не маразм! Гэта любоў, на якой трымаецца наша жыццё, — такой сілы, што тое пачуццё зможаш асэнсаваць, толькі калі ўжо не будзе каму сказаць "дзякуй" ці "прабач"... Нізкі паклон вам, Тацціяна, за ролю!

Бадзяга. У арыгінале — Мужык. Фенаменальна брутальны. У самым вульгарным сэнсе. Магутны. Просты, як... зашмальцаваная "пяцёрка". У яго ёсць толькі інстынкты і закладзеныя з маленства няхітрыя правілы жыцця сярод людзей. Ён існуе па гэтых правілах і парушае іх не дзеля карысці, а таму што моцы мае нашмат больш, чым розуму. На вайне гэты мужчына стаў бы адчайным байцом. Але вайны няма... І таму — турма. І, відавочна, "курорты" — калымскія. Такія ж брутальныя, як ён сам. І вось персанаж тут, перад вамі, ва ўсім харастве — у непараўнальным выкананні маладога акцёра Уладзіслава Маслоўскага, леташняга выпускніка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Праца Андрэя Хурсана (Машыніст) на першы погляд здаецца неадназначнай. "Пераігрывае", — зрабіла выснову жонка. Але ж і герой неадназначны. Літаратурна кажучы — экзальтаваная асоба. Па-простаму — нейкая знерваваная нікчэмнасць. З аднаго боку, відавочна абцяжараны інтэлектам чалавек. Усё жыццё шчыра імкнецца быць правільным. Не скрадзь, не забі, не пажадай. З іншага — слабы, баязлівы. Адсюль і вяршыня дасягненняў — машыніст цягніка. Нібыта не мала, але і не шмат. Адказнасць вялікая, заробак — дробны. Нават жонкі няма. І пакутуе персанаж, і зайздросціць, і крыўдуе. Таму герой і падаецца нейкім ненатуральным, што ўнутры яго — неадпаведнасць паміж здабыткамі і чалавечымі якасцямі. Але ж розум — вялікая сіла, якая перамагае нават баязлівасць. Вось галоўнае, што сказаў у фінале Машыніст. А я, пакорпаўшыся ў "Вікіпедыі", аўтарытэтна магу паведаміць жонцы: "Гэта — не пераігрыванне, гэта — гратэск". Выдатна!

Выснова — прэм'ера ўдалася. "Ехай!" стане выбітнай з'явай сталічнага тэатральнага жыцця. Аўтары спектакля выканалі галоўную задачу творцы — прымусіць гледача думаць.

Віктар ГАЎРЫШ

P. S. Быццам бы дробязь. Але ж пастаноўка зацікавіла таксама значэннем казы ў беларускім фальклоры. Высветлілася, з аднаго боку, што яна сімвал багацця і добрага ўраджаю. З іншага — злы і хітры персанаж. У народнай казцы казёл-барада адбірае ў лісы яе хату, усіх пужае і нікога да сябе не пушчае. Урэшце пеўнік праганяе ліхадзея жалезнай касой...

А звалі яе Лісапедкай

Давайце зноў пагуляем у словы. Вельмі прыемны, трэба сказаць, занятак. Гэта як у дзяцінстве: разабеш скарбонку і кешкаешся з манеткамі. Медзякі ў адзін бок адкідаеш, срэбра — у другі. І думаеш, як багацце патраціць.

Са словамі — прыкладна тое ж. Толькі гаворка не пра медзь ды срэбра — пра золата. Пры правільным стаўленні да словазбіральніцтва, канешне.

ТАК БЫ ЗАЎЖДЫ ПАМЫЛЯЦЦА

Моўныя хібы — яшчэ тая з'ява. Калі моўная памылка сімпатычная, дык гэта і не памылка зусім (паўтор тут, як вы разумееце, для эмацыйнага ўзмацнення душэўных парыванняў), а вензель ці віньетка для аздаблення думкі. Але хопіць жартаў...

Памятаеце народную песню, у якой ёсць такія словы: "А ў месяцы верасні выпала пароша..."? Вы правільна здагадаліся. *У месяцы верасні* — моўная памылка. Нават навуковую назву мае — плеаназм. Нібыта неапраўданы паўтор раўназначных ці блізкіх па сутнасці паняццяў. Калі б Марлен Хуцыеў пагадзіўся з такой пастаноўкай справы, дык ніколі не зняў бы геніяльны фільм "Быў месяц май". Словам, я — за такія памылкі.

ВЫНАЙСЦІ РОВАР

Вось калі здолеем узаконена ездзіць у *ліфце́*, тады пра гарманічнае развіццё грамадства можна будзе толькі марыць. (Спрачайцеся, мае крытыкі, ружовашчокія ды сівыя, спрачайцеся!)

А цяпер — зусім пра іншыя памылкі. Аднак спачатку пра лексічную эвалюцыю. Пасля вайны ровары звалі напышліва: *веламабілі* ці *веламашыны*. Тлумачыцца гэта, напэўна, тым, што "велік" каштаваў дорага, многім не па кішэні быў. Бацька згадваў, што гэтая тэхніка ледзь не прадметам раскошы лічылася. Праз гады з'явілася слова *веласіпед*. Потым — беларускае найменне з польскімі каранямі *ровар*.

Але я пра іншую назву, дужа мілую майму сэрцу. У нас на мовазнаўчай кафедры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта смяяліся: "Беларусы — лянівыя! Ці ж будуць яны адсочваць, як правільна вымаўляецца складанае запазычанае слова?" Прыкладна з такой прычыны і ўзнікла бліскучае — *лісапед*. Характарнае і атмасфернае, як цяпер кажуць.

ВОСЬ ТАКАЯ ЯНА, ЛЮБОЎ

Мой дзядзька Мішык асабліва пяшчотна называў свой ровар — Лісапедка. І калі на падпітку вяртаўся з Веткі ў родную Купрэеўку, Лісапедку вёў побач. Спрэс замілаванне. А калі траплялася лужына, Мішык смела крочыў па гразі, а велік каціў па сухім.

Вось такія стасункі. Веламашына — рэч бяздушная, Лісапедка — дама з характарам. "Даменцыя!" — казаў Мішык. Усе смяяліся, а ён радаваўся жыццю. Вялікім лірыкам і жыццялюбам быў мой дзядзька. У словах — купаўся. Праўда, яны былі збольшага не надта нарматыўнымі. Аднак пра гэта — у наступны раз.

ЗУСІМ НЕ "БАТЭРФЛЯЙ"

Яшчэ пра эвалюцыю слоў. Гадоў шэсцьдзясят таму, калі маю Ветку ў палон узяў футбол, мяч так і называлі — *футбол*. Чаму? Ад павагі да гэтага спорту? Свет трымаецца на неразгаданых загадках...

Вось зусім іншы ланцужок эвалюцыі (а мо дэградацыі?). Матылёк быў калісьці *мятлікам*. Пра тое мая бабуля распавядала. Цяпер так пэўны від травы называецца. А мятліка не зберагли. Яшчэ добра, што агульнаўжывальнае часам становіцца дыялектным. Сябра Санька згадаў днямі: у яго цёткі на Магілёўшчыне матылькі — *мя́тушкі*. Слова забіць цяжка, дзе-нідзе абавязкова прарасце.

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭННЯ

Звяртаюся да неабыякавага чытача. Нататкі мае не прэтэндуюць на званне навуковага даследавання (хоць і з'яўляюся настаўнікам-філолагам). Крый Божа! Авохці мне, калі так падумаеце. Тлумачэнне зусім іншае. Слова для мяне — як гліна для кераміста. А з адмысловых слоў і сказы — нібы звон. Чуеце, як звініць ад радасці мая душа!

Яўген РАГІН

Актыўна. Творча. Пазнавальна

У работнікаў нашай сферы кожная пара — гарачая: выставы, фестывалі, тэматычныя тыдні... Застаецца толькі здзіўляцца разнастайнасці актуальных формаў і метадаў.

Супрацоўнікі **Ашмянскай гарадской бібліятэкі** прынялі ўдзел у фестывалі летняга чытання "Кніжны бум". Яны шчыравалі на спартыўнай пляцоўцы (так-так, не здзіўляйцеся — правялі шмат рухавых гульняў), а таму ў прысутных была магчымасць умацаваць не толькі мышцы, але і веды. Як распавяла загадчык бібліятэкі **Людміла Зарэцкая**, цікавасць выклікала кніжная выстава "Ашмяншчына спартыўная", а таксама віктарына, загадкі на спартыўную тэматыку і пазлы.

■■■

Любоў да Бацькаўшчыны бярэ выток і ў любові да малой радзімы. Даведацца больш пра свой край і прасякнуцца пачуццямі да яго супрацоўнікі **Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі** дапамаглі пяцікласнікам мясцовай сярэдняй школы № 2. Дзеці завіталі ў мемарыяльны комплекс "Музей-зямлянка" ў в. Зачэпічы. Тут педагог Орлеўскай сярэдняй школы імя С. П. Шупені Марыя Пятроўна Сядзельнік правяла пазнавальную экскурсію пра партызанскі рух у часы Вялікай Айчыннай вайны, дэталёва спынілася на рабоце партызанскага злучэння пад камандаваннем С. П. Шупені. А ў в. Ракавічы вандроўнікаў чакала сустрэча з царквой Нараджэння Божай Маці. Ім расказалі пра гісторыю пабудовы храма, здабыццё цудадзейнага абраза Маці Божай, штогадовае свята, якое праходзіць у жніўні. Інфармацыяй падзялілася намеснік дырэктара **Юлія Міхайлава**.

■■■

Абласны праект "Тыдзень традыцыйнай культуры «Ад даўніны да нашых дзён»" на Слонімшчыне распачалі святкаваннем Тройцы. Разам з жыхарамі аграгарадка Сянькоўшчына творчыя калектывы клубных устаноў раёна завівалі бярозку, праводзілі абрад кумавання, танчылі мясцовую польку. Госці імпрэзы спявалі з народным ансамблем народнай песні "Жывіца", народным фальклорным калектывам "Чараўніцы-каравайніцы" і народным вакальным ансамблем "Славяначка". А сумеснымі намаганнямі спецыялістаў **Слонімскага раённага цэнтра культуры, народнай творчасці і рамёстваў** і Галіны Уладзіміраўны Захарчук быў рэканструяваны траецкі абрад "Ваджэнне куста", які існаваў у гэтай мясцовасці.

■■■

На Смаргоншчыне, у аграгарадку Крэва, прайшло свята гумару "Крэўскія жарты". Як сцвярджае **Ілона Смагур**, загадчык сектара рэкламы і менеджменту раённага цэнтра культуры, яно ладзіцца з 2018 года і ўжо стала брэндавым. Вясёлае тэатралізаванае шоу з забавамі і тэматычнымі падворкамі дорыць добры настрой усім наведвальнікам. А калі яшчэ і пачаставацца квасам "Крэўская рагатуха"...

Вера НІКАЛАЕВА

Кнігі, вартыя ўвагі

"КВЕТКА ПЕРУНА: КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫ ДАВЕДНІК"

Што? Сцэнарыі тэатралізаваных гульняў, свят і казак, распрацаваныя прафесійным і дасведчаным аўтарам, у багата ілюстраванай і фотаматэрыяламі, і нотамі кнізе пададзены для выканаўцаў і гледачоў розных узроставых груп; гэта новы падыход у адукацыі і выхаванні, што паўстаў з урадлівае глебы шматтысячагадовай мудрасці. Дзеля зручнасці фальклорныя праграмы размеркаваны па раздзелах: сцэнарыі для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту, тэатралізаваныя святы і абрады для вучнёўскіх і студэнцкіх калектываў, тэатралізаваныя прадстаўленні для прафесійных калектываў.

Матэрыял для гэтай кнігі спадар Кірчук збіраў у экспедыцыях па Беларусі больш за 30 гадоў. Такое выданне ёсць сапраўдным і неацэнным скарбам для адраджэння і папулярызацыі нашага бяздоннага багацця — беларускай народнай культуры.

Хто? Іван Кірчук, музыкант, кампазітар, фальклрыст, выкладчык, аўтар шматлікіх праграм, рэканструяваных абрадаў, свят, і Кацярына Кірчук, выпускніца кафедры этнаграфіі і фальклору факультэта народнай культуры БДПУ імя Максіма Танка, даследчыца ў галіне філалагічных навук.

Каму? Кіраўнікам фальклорных, тэатральных калектываў і студый, метадыстам устаноў культуры, рэжысёрам свят і абрадаў, бібліятэкарам, этнолагам, тэатразнаўцам і тэатрафілам, студэнтам і вучням, шырокаму колу чытачоў, якія цікавяцца культурай, народнай спадчынай і будучыняй Беларусі.

Андрэй КРАСІЦКІ

Гэтае выданне вы можаце знайсці ў сваёй бібліятэцы, кнігарнях або замовіць на сайце "Акадэмкнігі" з дастаўкай па Беларусі.

Тры ці дзесяць?

Развагі ў цяні Гервяцкага касцёла

Дзень вандроўкі — 27 мая. Мэта — Астравеччына, у першую чаргу — Гервяты. Астравец наведалі толькі для таго, каб падсілкавацца, бо дарога ад Мінска была далёка не хуткай. Словам, і не думаў пра райцэнтр пісаць. Але настолькі ўразіўся яго новым аблічам, што не мог не падзяліцца з чытачом станоўчымі эмоцыямі.

Істотна змяніўся стары горад. На адным з фасадаў — велізная выява Язэпа Гашкевіча, лінгвіста, першага дыпламата ад Расіі ў Японіі. Маляўнічы мурал — яскравы доказ таго, што мінуўшчыну ў Астраўцы любяць і паважаюць. Ухвальна!

А новы горад здзівіў урбаністычнай выразнасцю, грунтоўнасцю забудовы... Штосьці я з уступам зацягнуў. Проста суп у кавярні мадэрновага гандлёвага цэнтра вельмі спадабаўся. Аднак галоўная "страва" чакала нас у Гервятах.

РЭКЛАМЫ НЕ СТАЕ!

Упершыню я любаваўся Траецкім касцёлам гадоў пятнаццаць таму. Прычым любаваўся ў абсалютнай адзіноце. Нават крычаць хацелася ўсяму свету: "Людцы! Тут такая прыгажосць!" І людзі ўрэшце пачулі, адчулі і ўсвядомілі. Адны турыстычныя бусікі ад'язджалі, другія паркаваліся. Радасная мітусня была як у Івана Мележа на юравіцкім кірмашы...

Даруйце, але я цяпер — не пра чароўную готыку беларускага Версаля. Думкі ў цяньку велічнага касцёла скіраваліся зусім у іншае рэчышча.

Мая мама адзначала перад размовай: "Пачну здалёк". І расцягвала прэамбулу да максімальнай мяжы. Я — увесь у маму. А прэамбула мая — пра сувенірныя крамы.

Калі нашы дамы рамёстваў даказалі неардынарнасць, на вярхах зайшла гаворка пра рэалізацыю сувеніраў у салонах пры РДР. Я і па сёння ўпэўнены, што справа гэтая — надзённая і карысная. Але законы гандлёвых зносін якасна адрозніваюцца ад спрадвечных традыцый культуры. На месцах паспрабавалі "з'яднаць ваду і полымя". Атрымалася не вельмі, бо тавар трэба было рэкламаваць. Нібыта і выпускае Універсітэт культуры маркетолагаў, але ўражанне такое, што ўсе яны застаюцца ці ў абласных цэнтрах, ці ў сталіцы.

Між тым гандаль без рэкламы — як вяселле без нявесты. Вось і не пакаціла з сувенірамі. Сям-там салоны цішком прыкрылі. Рыхтык у бездапаможнасці распісаліся: тавар наш, маўляў, не надта, канкурэнцыі не вытрымлівае. Добра, што неглюбскія ручнікі — сусветна вядомыя і іх без рэкламы расхопліваюць. А як іншым быць?

Гэта тэорыя, а практыка вось якая...

ГАНДАЛЬ — НЕ ДА МЕСЦА

Ля касцёла ў Гервятах магніцікі прадавала іпэшніца. Прадставіцца не захацела. Прыцаніўся. Вельмі сціплая выява храма каштавала 10 рублёў. "Дарага, — кажу, — для такой драбязы". — "Купляюць — значыць, у самы раз", — гаворыць кабета. Спрачацца не стаў. Тут законы рынак дыктуе, таму гандаль, як дадае рэалізатарка, не да месца. Да слова, за тыя паўгадзіны, як я ў сітуацыі разбіраўся, не заўважыў чамусьці, каб турысты за тыя вырабы біліся.

Падобная сітуацыя і пад паветкай побач. Тут прадукцыя больш якасная. Магніцік можна прыдбаць і за сем рублёў. У асартыменце — знакаміты гліняны тавар з Івянца. Дарагі, натуральна. Пытаюся ў прадаўца, ці ёсць на прылаўку сувеніры з Астравецкага раённага цэнтра рамёстваў. Няма! І не бывае.

ІПЭШНІК, РАМЕСНІК, МАЙСТАР

Трэба разабрацца вось у чым. Вазьму хаця б маю любімую Магілёўшчыну. У штатах раённых дамоў рамёстваў шчыруюць майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці. У рабочы час яны завіхаюцца дзеля таго, каб асартымент на продаж быў якасным і пастаянна пашыраўся. Майстар можа працаваць на сябе, аднак у вольны, асабісты час.

А зараз пытанне рубам: хто павінен збіць кошты на сувеніры ў Гервятах і прапанаваць гасцям якасны нацыянальны прадукт? Правільна! Майстры Астравецкага раёна — супрацоўнікі Цэнтра рамёстваў. Але я тых умельцаў не заўважыў. Выпадковасць?

КАЛІ ГРОШЫ НЕ ПАТРЭБНЫЯ

З гэтым пытаннем я завітаў у кніжную скарбніцу і клуб аграгарадка Гервяты. Бібліятэкар **Таццяна Радкевіч** толькі атрымала на пошце "Культуру". Адарвалася ад прагляду і паведаміла, што астравецкія сувеніры можна набыць у Астраўцы. А загадчык СДК **Настасся Ядзевіч** дадала, што 4 чэрвеня ў Гервятах ладзіцца свята ля Траецкага касцёла. Вось астравецкія майстры на мерапрыемства і завітаюць. Але Траецкі фэст — раз на год.

Калі грошы на бойкім месцы не жадае зарабіць гаспадар краю, дык за яго з задавальненнем будзе шчыраваць ці ганчар "з-за мора", ці мясцовы халтуршчык. Я разумею, творца любіць лічыць не манеты ва ўласнай кішэні, а зоркі на небе. Вось тых манет пастаянна і не стае. Лічыце зоркі, аднак не варон! А ў аснову рэкламы, я перакананы, павінны легчы пастулаты пра "дорага і кепска" ды "танна і якасна". Выключэнні бываюць, але яны не больш, чым выключэнні.

Да слова, Настасся Ядзевіч і Таццяна Радкевіч — адзіныя ў Гервятах работнікі культуры. Цяжка, аднак спраўляюцца. Схіляю перад імі галаву. Таксама і за тое, што наша выданне любяць, чытаюць ды выпісваюць. Думаю, што якраз да месца і рэклама будзе: "«Культура» — газета для прафесіяналаў!"

"СУМЛЕННЯ НЯМА"

Паехалі дахаты, але няспешна, з павагай да навакольнай прыгажосці. У Солах згадаў сябра Мар'яна Дуксу. Яго нябесныя вершы цяпер слухаюць анёлы... Спыніліся ля касцёла Маці Божай Ружанцовай, які цягам стагоддзя праколвае тутэйшае неба. Бойкае месца, турыстаў хапае.

Пазнаёміліся з фатографам Генам. Ён вырабляе цудоўныя магніцікі, сам іх прадае. Майстры з РДР Гену канкурэнцыі не ствараюць. А сувеніры каштуюць тры рублі! Ці ведае ён пра цэнавую сітуацыю ў Гервятах? Адказвае:

— Ведаю! Сумлення няма!

Гена — альтруіст? Не, творца з адчуваннем адказнасці за лёс роднай зямлі, роднай культуры. Ён нават асветнікам сябе называе. І правільна робіць.

КАБ КЕПСКА НЕ БЫЛО!

Увечары завіталі ў Жупраны на магілу Францішка Багушэвіча — неўтаймоўнага барацьбіта за беларускую долю. Па дарозе ў Мінск успомнілі паэму "Кепска будзе!". І выснова прыгадалася: калі сваё аддаць, чужое не выратуе.

А магніцік за тры рублі я ў Гены купіў. Трэба падтрымліваць айчыннага творцу!

Яўген РАГІН

Мінск — Гервяты — Солы — Жупраны — Мінск

Фота аўтара

Генадзь з Солаў

Настасся Ядзевіч паказвае гаспадарку

Таццяна Радкевіч чытае "К"

Творца любіць лічыць не манеты ва ўласнай кішэні, а зоркі на небе. Вось тых манет пастаянна і не стае. Лічыце зоркі, аднак не варон!

Касцёл у Гервятах

Касмічныя прасторы кінематографа

Ці справіўся з выклікам “Выклік”?

Самая гучная расійская прэм’ера — “Выклік” Кліма Шыпенкі — ужо больш за месяц знаходзіцца ў пракаце, аднак касмічных вяршынь пакуль не дасягнула. Нягледзячы на піяр-кампанію, што разгарнулася задоўга да выхаду фільма на вялікія экраны, цікавасць кінапублікі да карціны застаецца невысокай. А касавым зборам усё яшчэ не ўдалося ажыццявіць прадказанні крытыкаў і пабіць рэкорд касавага гіганта “Чабурашкі” Дзмітрыя Дзячэнкі. Ці сапраўды выхад у адкрыты космас аказаўся няўдалым? Або ўся справа ў завышаных чаканнях гледачоў? Паспрабуем разабрацца разам.

Уладзімір (Мілаш Бікавіч) і Яўгенія (Юлія Перасільд)

По сюжэце, адзін з членаў экіпажа МКС атрымлівае сур’ёзную траўму. Вярнуць яго на Зямлю для аперацыі немагчыма, таму кіраўнік палётаў Волін (Уладзімір Машкоў) вырашае адправіць на станцыю ўрача. Пасля працяглых выпрабаванняў у цэнтры касмічнай падрыхтоўкі выбар падае на таракальнага хірурга Яўгенію Бяляеву (Юлія Перасільд). Яна павінна правесці складаную аперацыю ва ўмовах бязважкасці, ад якой залежыць шанц касманаўта вярнуцца на Зямлю жывым.

НЕ МЕСЦА ДЛЯ КАЗАК

У “Выкліку”, безумоўна, ёсць на што паглядзець. Павільёны цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў захапляюць памерамі і тэхнічным абсталяваннем, уражваюць і эпізоды, знятыя ў космасе. Але гэта не водвошчнае кіно. Многія гледачы падмануліся, чакаючы ўбачыць на вялікім экране космас, той самы яркі і незвычайны, які стварыў кінематограф у пагоні за ваўэфектам. Але забыўся выхаваны на фантастыцы глядач, што сапраўдныя прасторы бязмежнай галактыкі выглядаюць далёка не так, як паказваюць у галівудскіх казках. Сапраўдны космас захоўвае бясконцае маўчанне і такую ж бязмежную усёпаглынальную цемру.

Аднак вось гэта і зачароўвае: усведамленне таго, што кінематаграфічная, умоўная рэчаіснасць на нейкі момант перасякае нешта сапраўднае, але небяспечнае, таямнічае. Верагодна, з гэтай прычыны “Выклік” і не заяўляўся як фільм пра космас і месца чалавека ў Сусвеце. Гэта было б чарговай фантазіяй, якая зноў стала ў шэраг з выдумкамі на тэму “што і хто чакае нас за межамі Зямлі”. Расійскія кінематаграфісты паказалі іншае: куды б ні пайшоў чалавек, ён бярэ з сабой сябе, і нават за межамі Зямлі застаецца падуладным яе жарсцям і перажыванням. Абыякавы да людскіх страсцей космас тут выступае маўклівым назіральнікам, які дазваляе ўсвядоміць: лёс чыніць не цуд, а мы самі.

ЯК У ЖЫЦЦІ

“Выклік” як кіно, звязанае з касмічнай тэмай, адрознівае поўная адсутнасць відавочных ворагаў. Канфлікт галоўнай гераіні — унутраны. Яна не змагаецца з прышэльцамі, ёй не пагражаюць нябачаныя галактычныя сілы. Яе галоўны вораг — успаміны, якія, нібы якар, утрымліваюць у мінулым. Пагаршае стан і паўсядзённыя бязладзіцы ў сям’і, на працы. Таму ў перамяшчэнні героя, які завязнуў у цесных зямных праблемах, у бязмежныя касмічныя прасторы адчуваецца кантраст, бо гэта літаральна выхад у іншы свет. Выбар асабістай драмы ў якасці асноўнага канфлікту гісторыі выглядае выйгрышна менавіта дзякуючы сувязі з рэальнасцю. Суперажываючы галоўнай гераіні, глядач паглыбляецца ў гісторыю. І вось ужо ён праходзіць выпрабаванні, аказваецца ў космасе і пераадольвае нябачную ўнутраную мяжу перад нязведанай будучыняй.

Экраннае пераўвасабленне Юліі Перасільд захапляе і натхняе сваёй натуральнасцю. Яе касмічны подзвіг бяспрэчны, але акцёрскі талент заслугоўвае куды большай увагі. Яна не толькі пражыла ролю ад першай да апошняй секунды, але і выстаяла ў спартанскіх умовах здымак у бязважкасці з непрафесійнымі акцёрамі — сапраўднымі касманаўтамі.

Гарманічным аказалася і ўзнікненне Уладзіміра Машкова ў ролі кіраўніка палётаў Воліна, у якім знайшло ўвасабленне важнага для гісторый пра ўнутраныя пераадоленні архетыпа Настаўніка. Строгасць, стрыманасць і крыха па-бацькоўску цёплай веры ў галоўную гераіню ў выкананні Машкова выглядалі ярка і праўдападобна, што засланяла сабой іншага “настаўніка” — хірурга Валянціна Барысавіча ў выкананні Андрэя Шчэпачкіна. Роля ж галоўнага прэтэндэнта на сэрца Яўгеніі, Уладзіслава, дзякуючы таленту Мілаша Бікавіча не застыла на адзнацы толькі прывабнай знешнасці. Герой хай і амбіцыйны, а часам надта самаўпэўнены, але ён з хірургічнай дакладнасцю прабіў лёд як у душы Яўгеніі, чыё каханне змог заваяваць увагай і ўменнем трымаць градус самалюбавання на адэкватнай метцы, так і ў сэрцы гледача. Ва ўсякім выпадку, гэтае амплуа далёка ад стэрэатыпных палкіх прыгажуноў з пустой галавой.

> “Выклік” стаў сапраўдным выпрабаваннем для яго аўтараў, якое яны, як і героі гісторыі, паспяхова пераадолелі, задаўшы новую планку для сусветнага кінематографа.

ЧОРНЫЯ ДЗІРКІ

Нягледзячы на зладжаную працу аўтараў фільма, пераканаўчую акцёрскую ігру і незямныя пейзажы, у гісторыі засталіся некаторыя незапоўненыя прабелы, якія сур’ёзна нашкодзілі фільму. Ад прадказальнага фіналу, які стаў вядомым задоўга да прэм’еры дзякуючы шырокай маркетынгавай кампаніі, уражанні не надта пацярпелі. Аднак калі звычайна глядач прыходзіць у кіно, каб даведацца, чым усё скончыцца, то на “Выклік” ішлі, каб усвядоміць, што стаіць за такім фіналам. У прыватнасці, чаму з усіх хірургаў выбралі менавіта Яўгенію, якую ўвогуле пускаць на касмічны карабель не збіраліся? Гэты выключна важны для фільма момант застаецца за кадрам, таму ад пытання ў лоб: “Ці гатовая вы ляцець у космас?” — не адчуваеш нічога, акрамя пустога пафасу.

Баласт у карціне таксама прысутнічае — пастаянныя паўторы ўспамінаў галоўнай гераіні аб аўтамабільнай катастрофе, у якой загінуў яе муж. Рух карціны быў бы лягчэйшым, калі аўтары пазбавіліся б ад цыклічнай сцэны, сэнс якой можна было змясціць у некалькі яркіх фрагментах. Бо кіно — мастацтва мантажу, ды і не варта недаацэньваць гледача: скласці візуальны пазл, звязаўшы пачарговыя сцэны, няцяжка. Гэта надало б успамінам уласцівай ім фрагментарнасці, а фільму — дынамікі.

А ЦІ ВАРТА БЫЛО?

Адказваючы на пытанне крытыкаў: варта. Кіно ніколі не спыняецца на дасягнутым, пастаянна ідзе на рызыку і ўстанаўлівае новыя законы, зменьваючы або зусім пазбаўляючыся ад старых. “Выклік” стаў сапраўдным выпрабаваннем для яго аўтараў, якое яны, як і героі гісторыі, паспяхова пераадолелі, задаўшы новую планку для сусветнага кінематографа. І справа зусім не ў касмічнай кінагонцы, а ў бясконцым імкненні творчасці, якое не адступіць, нават калі ад небяспекі яго аддзяляе тры міліметры. Бо за імі — адкрыты космас магчымасцяў.

Яўгенія ГАБЕЦ

РЭЙТЫНГ: ★★★★☆

Кадры з фільма

Праверка на трываласць

Чым здзівіць новая праграма Белдзяржцырка?



Пад купалам мінскага цырка адгрымелі “Рытмы Афрыкі” і на змену ім прыйшла новая праграма — “Неверагодны атракцыён”. Гледачам давядзецца прайсці тэст на стрэсаўстойлівасць, бо большасць нумароў дакладна выкліча мурашы па скуры. У новым шоу на арэне аб’ядналіся артысты з Беларусі, Расіі і Бразіліі, каб у чарговы раз праверыць межы чалавечых магчымасцей. Ці прымусяць здрыгануцца экстрэмальныя нумары нават дарослага, высвятляла газета “Культура”.

Надышла летняя пара — час для адпачынку і забаў. Менавіта гэта і натхніла каманду Беларускага дзяржаўнага цырка стварыць адзіны ў свеце парк цыркавых атракцыёнаў, дзе “Кола агляду” ператвараецца ў “Кола смеласці”, што займае дух, а звыклы “Цір” — у экстрэмальнае “Кіданне нажоў”.

Пра тое, як стваралася праграма, распавядае яе мастацкі кіраўнік **Вітаўтас Грыгалюнас**:

— Прыдумаць сцэнарый для новага прадстаўлення надзвычай цяжка, бо ўсё павінна спачатку сысціся ў думках, а выкласці тое на паперы можна за некалькі гадзін. Затым пачынаецца сумесная праца рэжысёра, харэографа, дырыжора, якія прадумваюць розныя нюансы. І надыходзіць самы складаны працэс, які адымае шмат фізічных і маральных сіл: прыязджаюць артысты, і мы працуем літаральна 24/7 на працягу тыдня. Далей адбываецца выпрацаваная гадамі заканамернасць: прэм’ера, некалькі шоу — і праграма пайшла ў бой. Мы ствараем адно вялікае прадстаўленне з некалькіх маленькіх спектакляў. І тут важна разумець, што поспех нумара крыецца ў цудоўнай трукавай частцы і пасыле самога артыста.

АДВАЖЫЦЦА ТОЛЬКІ СМЯЛЬЧАК

Гарачая, запальная праграма пачынаецца з нумара “Кола смеласці”, які прадстаўляюць два артысты з Бразіліі.

— Канструкцыя называецца “лапенду” (у перакладзе — маятнік). Гэты трук, які мы асвоілі дзякуючы нашым бацькам, вельмі папулярны на нашай радзіме. Выконваць яго, безумоўна, небяспечна, бо ён не прадугледжвае ніякай страхоўкі, нават падэшва абутку для лепшага счаплення нічым не змазваецца, — тлумачыць **Сант’яга Гансалес Джэймс**.

Падчас нумара адзін з артыстаў смела крочыць па коле, у той час як яго калега ў другім коле нарошчвае хуткасць. Такое відовішча прымусіла ўражлівых гледачоў мацней уціснуцца ў крэсла. Затым адзін з артыстаў скакаў праз скакалку на коле, што беспрыпынна круцілася, а напрыканцы надзеў павязку на вочы, каб канчаткова пераканаць прысутных: у гэтым атракцыёне яму няма роўных!

Затым беларускія паветраныя гімнасты **Наталля Нарышкіна** і **Глеб Казленка** паспрабуюць акунуць вас у атмасферу лёгкасці, распавёўшы сямісвілінную гісторыю кахання двух маладых людзей — таленавітага фатографа і прыгожай мадэлі. Менавіта з гэтым нумарам нашы землякі ў жніўні летась выйгралі Гран-пры Міжнароднага фестывалю цыркавога мастацтва “Рэха Азіі” ў Казахстане, а сёлета ў сакавіку паспелі паказаць яго ў Іспаніі. Як адзначае дырэктар Белдзяржцырка **Уладзімір Шабан**: “Санкцыі не ўплываюць на цыркавую сусветную садружнасць па адной простай прычыне: калі ты здольны здзівіць гледача, табе будуць рады ў любым кутку свету. У кастрычніку нашых паветраных гімнастаў запрасілі паказаць свой талент у Італіі. І ўжо ідуць перамовы аб тым, каб восенню ў наш цырк прыехалі італьянскія артысты”.

Порцыю замілавання атрымае кожны госць Белдзяржцырка, убачыўшы нумар “Дрэсіраваныя поні”, дзе восем мініяцюрных грацый выконваюць указанні **Сяргея Прасцяцова**, уладальніка “Бронзавага клоўна” Міжнароднага цыркавога фестывалю ў Монтэ-Карла.

ЧАЛАВЕК МАЦНЕЙШЫ ЗА МАШЫНУ?

У канцы першага аддзялення раім “прышпіліць рамяні бяспекі”, бо на арэне з’явіцца асілак **Феруз Юсупаў**, які сапраўды ўразіць кожнага. Ён прыехаў у Мінск упершыню і пачынае свой нумар з размінкі, падымаючы гіры вагой у 180 кілаграмаў зубамі, а затым пераходзіць да больш сур’ёзных трукаў: на цыркавую арэну выязджае бус, і артыст па-джэнтльменску запрашае дзяўчат з шоу-балета сесці ў машыну. Агульная вага аўто складае 3 тоны 120 кілаграмаў, і наш асілак цягне яго зубамі. Зала выдала захоплены “ох” і не магла спыніць апладысменты. Але самае інтрыгуючае вопытны атлет пакінуў на потым: Феруз лёг на манеж, зверху на яго паклалі дошкі, і па ім праехаўся... аўтамабіль! Пасля гэтага манеўру на некалькі імгненняў гледачы былі агаломшаныя, а затым пачалі пляскаць у ладкі мацней чым калі.

Складаецца адчуванне, што гэтым разам цыркавая праграма вырашыла праверыць нас на атракцыёне смеласці, бо падчас некаторых трукаў вочы міжволі заплюшчваліся ад страху. Напрыклад, падчас выступу беларуса Андрэя Гоманава, які прадставіў публіцы нумар “Матрыкс”, артыст раскруціў сваю партнёрку ў коле і пачаў кідаць туды нажы. Гэты смяротны нумар наш зямляк паказаў у Сінгапуры, затым здзіўляў ім ва Уладзівастоку, Хабараўску, Іркуцку. І нават паспеў паўдзельнічаць у знакамітым брытанскім шоу “Britain’s Got Talent” у Лондане.

Вольга Бязмен з коцікам

КОТ, ЯКІ ЛЁТАЕ ПАД КУПАЛАМ ЦЫРКА

Можна заўважыць, наколькі лагічна складзена праграма. Бо пасля кожнага ўсплёску адрэналіну публіку накрывала хваля замілавання.

Чароўная **Вольга Бязмен** нарадзілася і вырасла ў Мінску, на працягу 25 гадоў працуе ў цырку: “З маім мужам паказваем нумары з коткамі. Дзіўна, але дома, на беларускай арэне, выступаю ўпершыню. Шмат працуем у Расдзяржцырку, а таксама гастралюем па ўсім свеце. Прызнаюся шчыра, паказваць нумары перад роднымі гледачамі вельмі адказна. У нашым перформансе задзейнічана шэсць катоў: тры звычайныя і тры пароды мэйн-кун. Гэта выглядае вельмі эфектна, бо мой рост складае 1 метр 38 сантыметраў і побач з такімі вялікімі пухнацікамі я здаюся вельмі мініяцюрнай. Мае ўлюбёнцы вельмі наравістыя ў дрэсуры, таму мала хто выступае з гэтымі жывёламі. Па адчуваннях, яны выхоўваюць нас, а не мы іх. Кожны раз, выходзячы на манеж, не ведаем, што будзе адбывацца: могуць чагосьці спалохацца ці проста капрызіць. Напрыклад, хтосьці з катоў не любіць, калі людзі ходзяць падчас шоу, нават можа чакаць, пакуль усе сядуць на свае месцы. У такіх выпадках даводзіцца ўключаць артыстызм і скараць гледачоў сваім зачараваннем”.

На гэты раз падапечныя Вольгі былі вельмі паслухмянымі, смірна сядзелі на месцах і чакалі каманды гаспадыні. Самы смелы коцік залез на платформу ў выглядзе паўмесяца і лунаў у паветры пад купалам манежа.

Усе ахвочыя змогуць убачыць “Неверагодны атракцыён”, які пачаўся 27 мая, да 19 жніўня. Гэтая праграма ідэальна падыходзіць для новага летняга сезона: экстрэмальныя нумары змяняюцца пацешнымі выступамі з хатнімі жывёламі. Клоўны актыўна ўзаемадзейнічаюць з публікай і выклікаюць усмешку на тварах усіх маленькіх гасцей. Увесь час шоу трымае ў эмацыйным напружанні і прымушае ўважліва сачыць за дзеяннем на арэне нават гледачоў з апошніх радоў. Пасля прагляду складваецца дакладнае адчуванне, што цырк — месца, дзе даследуюцца магчымасці нашага цела, і здаецца, яго межы яшчэ да канца не вывучаныя.

Настасся ЮРКЕВІЧ

Фота аўтара

Асілак Феруз Юсупаў цягне зубамі машыну

Станіслаў Жукоўскі

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі працуе выстава "Станіслаў Жукоўскі: пункт прыцягнення — сядзіба". Імя сусветна вядомага мастака на радзіме не проста на слыху. Творцу і шануюць, і вывучаюць. Але ёсць у яго біяграфіі дата, якая прымушае даследчыкаў прачынацца ўначы ад жаху. А дата гэтая — год нараджэння. Бо ад яе залежыць, калі святкаваць юбілеі і нават выпускаць памятныя маркі. І сёлета, здаецца, здарыўся пасаж.



Міхаіл Вербаў, "Станіслаў Жукоўскі", 1922

Станіслаў Жукоўскі
(1875—1944)
Сусветна вядомы жывапісец, настаўнік; сябра Таварыства перасоўнікаў. Пасля рэвалюцыі 1917-га ўваходзіў у Камітэт аховы помнікаў, рупіўся аб захаванні помнікаў старасвеччыны і пераўтварэнні найбольш знакавых сядзіб у музеі. У творчым даробку майстра — каля 670 работ, якія знаходзяцца ў вядучых музеях свету. У 1944-м загінуў у нямецкім канцлагеры на тэрыторыі Польшчы.

Міхал Баброўскі
(1784—1848)
Славіст, даследчык старажытных славянскіх рукапісаў і старадрукаваных кірылічных выданняў, доктар багаслоўя, прафесар Віленскага ўніверсітэта. Заснавальнік беларуска-літоўскага філалагічнага гуртка. Лічыцца адным з першых творцаў "беларускага нацыянальнага адраджэння" альбо "беларускай нацыянальнай ідэі".

Юзаф Крашэўскі
(1812—1887)
Пісьменнік, гісторык і фальклрыст, рэдактар, выдавец, публіцыст, філосаф. Аўтар найбольшай колькасці выдадзеных кніг у гісторыі літаратуры: яго спадчына складае каля 600 тамоў раманаў і аповесцей, паэтычных і драматычных твораў, а таксама работ па гісторыі, этнаграфіі, фальклярыстыцы, падарожных замалёвак, публіцыстычных і літаратурнакрытычных артыкулаў. Пісьменнік занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса як "чэмпіён эпохі гусінага пяра".

НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА

Кожная цікавая гісторыя, па законах жанру, мусіць мець пачатак, пажадана, з інтрыгаю. У нашым выпадку ўсё пачалося з "нямой сцэны". Праўда, не ля фантана, а ў рэдакцыйных кулуарах. Абмяркоўваючы выставу і асобу Станіслава Жукоўскага, раптам мы выйшлі на пытанне, калі ж належыць святкаваць 150 гадоў з дня нараджэння мастака — сёлета ці ў 2025-м? Бо, як аказалася, аднагалосся ў гэтай партыі ў "жукоўсказнаўцаў" няма і па сёння. І адным з такіх сведчанняў з'яўляюцца звычайныя паштовыя маркі, што былі выпушчаны ў 2023-м у Беларусі і Расіі з нагоды "150-годдзя". Такую блытаніну ў два гады яшчэ можна зразумець, калі гаворка вядзецца пра асобу часоў Змрочнага Сярэднявечча. Ці калі на абмеркаванне выстаўляюцца даты "новага" і "старога" стыляў, дзе розніца складае 11-12 дзён. Але два гады ў дачыненні да асобы знакамітага мастака, якога многія з нашых сучаснікаў яшчэ маглі бачыць на ўласныя вочы (Жукоўскі загінуў у канцлагеры ў 1944-м)?..

ТАЯМНІЦЫ ЖУКОЎСКАГА

Вядома ж, мы не маглі не паўдзельнічаць у "філатэлістычных фальстартах" (некалькі асобнікаў беларускай маркі набылі). Не змаглі мы і прайсці міма "юбілейнай" загадкі. Праўда, яе разгадка аказалася даволі простай. Наш добры знаёмы Шэрлак Холмс называў такія выпадкі "справай на адну люльку". Яшчэ ў 1973-м савецкі мастацтвазнаўца Уладзімір Лапшын апублікаваў метрычны запіс аб хросце Станіслава, сына Юльяна Жукоўскага і Марыі з Вярбоўскіх, народжанага ў 1875 годзе. Пазней, у 1982-м, іншы даследчык і аўтар манаграфіі пра мастака Міхаіл Гарэлаў яшчэ раз прывёў гэты запіс і даў тлумачэнне, чаму сам Жукоўскі сфальсіфікаваў дату нараджэння пры паступленні ў вучэльню (дадаўшы сабе пару гадоў). Навошта? Каб не пытацца ў бацькі дазволу і не прадастаўляць гэты дазвол камісіі (бацька быў катэгарычна супраць таго, каб сын стаў мастаком). Так у свет паляцела дата "1873". Усё проста. Блытаніна сёння ж узнікае тады, калі папулярызатары творчасці Жукоўскага абмінаюць увагай даробак спадароў Лапшына і Гарэлава. Вось толькі, хоць даследчыкі і разабралі біяграфію мастака, прасачыўшы яго жыццёвы шлях год за годам, разблытваць радаводныя таямніцы пакінулі іншым. Паспрабуйце ўявіць, што і па сёння невядомыя даты жыцця бацькоў Жукоўскага. Не кажу ўжо пра імёны дзядоў мастака, якія таксама невядомыя. Дзіва!

СПОЙЛЕР

Ад той рэдакцыйнай размовы прамінула некалькі тыдняў, за якія ўдалося зрабіць пару цікавых знаходак. Па-першае, трошкі развіднелася над радаводам маці Станіслава Жукоўскага, якая нібыта паходзіла з Варшавы і вучылася ў Парыжы. Яе продкі, не надта заможныя, жылі ў Ваўкавыскім павеце і пра Вільню, Варшаву і Парыж маглі толькі марыць. Па-другое, была знойдзена метрыка смерці мастаковай маці. Быццам бы нічога асаблівага, элементарная справа. Але аказалася, што ў пэўным сэнсе гэта сенсацыя. Бо на мапе "Шлях Жукоўскага" дадаўся важны пункт — Шарашова. Ды яшчэ гэта адзіны дакумент, які датычыцца прысутнасці Жукоўскіх у Старой Волі. Успаміны і карціны ёсць, а вось дакументаў не было. Аб нашых знаходках мы распавядзем асобна, а сённяшні расповед пра вандроўку па мясцінах Жукоўскага, у якую мы адправіліся на выхадных. Вандроўку, інспіраваную знаходкамі.

МІНСК — АРАНЧЫЦЫ — ШАРАШОВА

Каб зранку быць на месцы, прыйшлося выязджаць вечаровым цягніком, ноч ехаць з перасадкамі. Каб не заснуць ва ўтульнай зале чакання вакзала Баранавічы-Палескія, я гартаў кнігу пра Жукоўскага (аўтар М.Гарэлаў) , якую ў 1988 годзе тут, у Баранавічах, па-даравалі маёй маці калегі Рахлеўскія. Быў час яшчэ раз прадумаць маршрут, які ўключаў не толькі шматлікія аб'екты ў Шарашове, але і Стараволю і Пружаны. Ноч была без сну, аднак потым, як узнагарода за трываласць, настала раніца і першыя промні сонца залілі сваім святлом станцыённы будынак у Аранчыцах. Трапіўшы праз Пружаны ў Шарашова, першай справай адправіўся я на старыя каталіцкія прыкасцельныя могілкі. Менавіта на іх 26 сакавіка 1887 года пахавалі маці Станіслава Жукоўскага, памерлую 24-га сакавіка ад "катара страўніка" ў фальварку Стараволі (даты па старым стылі). Спадзевы, што яе магілу, якая каля ста гадоў нікім не даглядалася, лёгка знайсці, былі не надта вялікімі. Але ўсё патрэбнае для пошуку мелася ў заплечніку (шуфлік, крэйда, шчотка — палявы набор даследчыка).

Станіслаў Жукоўскі, "Май", 1896 (сядзіба ў Старой Волі)

Шарашова. Касцёл і магілы Крашэўскіх

Аказалася, што старая частка могілак была ўшчыльнена ў 1950—1990-х, таму надмагілляў XIX і пачатку XX стагоддзяў засталося вельмі мала. Дый тыя ў свой час трапілі на вока марадзёрам, якія пазрывалі або паразбівалі металёвыя шыльды і нават павыкрадалі надмагільныя камяні (у некалькіх старых агароджах пусткі). Саму магілу я не знайшоў, але прыкладнае месца, дзе яна магла быць, вызначыць удалося па ацалелых помніках 1888 года. Не змаглі мне дапамагчы і мясцовыя жыхары, парафіяне касцёла, якія нават не чулі пра "знакамітага мастака Станіслава Жукоўскага". Падумалася, што памятны камень і інфармацыйны стэнд з расповедам пра Жукоўскіх на прыкасцельным цвінтары быў бы вельмі дарэчы.

На тым жа цвінтары, адразу за касцёлам, знаходзяцца магілы продкаў і сваякоў нашага знакамітага пісьменніка Юзафа Крашэўскага (гл. "К" № 20, 2023). Вось толькі не кожны мінак пра тое здагадаецца. Тут таксама не зашкодзіў бы невялічкі інфармацыйны стэнд.

Гісторыя касцёла Найсвяцейшай Троіцы пачалася ў 1848 годзе. Заменены на зернясховішча ў савецкі час, пазней ён быў перададзены вернікам, адрэстаўраваны і сёння цешыць вока сваёй дагледжанасцю. Вялікая колькасць драўляных скульптур, якія захоўваліся ў касцёле, былі ў свой час перавезены ў сталічны Нацыянальны мастацкі музей, дзе іх можна ўбачыць у сталай экспазіцыі беларускага мастацтва. Аб гэтым парупілася ураджэнка Пружанаў Алена Аладава, першы дырэктар музея.

Удалося паразмаўляць і з ксяндзом Яцкам, які аказаў вандроўніку гасцінным прыём. Жыве спадар Яцак у Шарашове ўжо 30 гадоў, але, на жаль, таксама не чуў пра Жукоўскіх і іх сувязь з Шарашовам.

ДА МІХАЛА БАБРОЎСКАГА

Акрамя Жукоўскіх і Крашэўскіх, шчыльна звязана гэта мястэчка і з Міхалам Баброўскім, уніяцкім, а пазней праваслаўным святаром, былым прафесарам Віленскага ўніверсітэта. Доўгі час ён жыў у Шарашове, быў святаром у Прачысценьскай царкве. Памёр у 1848-м, калі па ўсёй Беларусі лютавала эпідэмія халеры. У Мінску яна забрала жыццё паловы горада, у тым ліку і асветніка і гуманіста Дамініка Манюшкі, дзядзькі славутага кампазітара. Пахавалі яго на Залатой Горцы, за касцёлам. Сёлета, 17 жніўня, у яго будзе юбілей — 235 гадоў нараджэння, і можна ўсталяваць пры касцёле памятны камень (гл. "К" №39, 2022).

Месца, дзе стаяла старая драўляная царква, разабраная ў савецкі час на дровы, нічым не адзначана. Адзінае, што нагадвае пра яе, — толькі драўляная званіца 1799 года (помнік рэспубліканскай значнасці), у якой 27 ліпеня (па старым стылі) дзень народзінаў (дата завяршэння будоўлі выразана майстрам над увахо-дам). Другая царква, у гонар Святога Мікалая, мураваная, была пабудаваная ў 1872-м. На жаль, была яна зачыненая. Гледзячы на яе, згадаў карціну Станіслава Жукоўскага 1902 года, якая так і называлася — "Царква". На ёй намаляваны вечаровы храм, вельмі падобны да гэтага. Падобны, але, на жаль, не ён.

Месца пахавання Міхала Баброўскага

У беларускай Вікіпедыі ёсць выдатны артыкул пра гісторыю самога мястэчка, таму мы абмяжуемся толькі першай згадкай Шарашова ў дакументах Вялікага Княства Літоўскага — 26 студзеня паселішча было падоранае камянецкаму намесніку Мікалаю Насуту Шампарту. І здарылася гэта... у 1380 годзе (!).

КАПЛІЦА БЕЗ СТАТУСУ. ТАЛАКА

На могілках за мястэчкам, раней уніяцкіх, а цяпер праваслаўных, у 1824-м была пабудаваная капліца (царква) святых апосталаў Пятра і Паўла. Праз год яна адзначыць 200-годдзе. Хоць яна і з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства з рысамі класіцызму і згаданая ў Зборы помнікаў гісторыі і культуры Брэсцкай вобласці, на ёй і па сёння ані шыльды з назвай, ані шыльды са статусам. Хоць звонку царква і выглядае адносна добра, па словах мясцовых жыхароў, будынак патрабуе неадкладнага ўнутранага рамонту.

Магіла Міхала Баброўскага, якая знаходзіцца адразу за царквой, па шчырасці, здзівіла. На ёй стаіць сучасны помнік, вакол якога пляцоўка выкладзена пліткай. Але знайсці на помніку і малаінфармацыйным стэндзе, неахайна ўсталяваным побач, хоць адно слоўка на беларускай мове, на вялікі жаль, не ўдалося. Ці такім быў бы запавет святара, які шанаваў родную мову і лічыцца адным з творцаў "беларускага нацыянальнага адраджэння"? Пытанне рытарычнае.

Дарэчы, як так сталася, што на могілках Беларусі сёння родную мову сустрэць — вялікая ўдача? Здаецца, усе помнікі з беларускімі надпісамі можна змясціць на адных шарашоўскіх могілках.

З такімі думкамі змагаўся я з чэзлай зелянінай на месцы пахавання Міхала Баброўскага, а потым запаліў зніч і разгаварыўся з жанчынай, якая працавала побач. Аказалася, парадак вакол магілы Баброўскага — і яе заслуга. Бо, бываючы ў сваякоў, ніколі яна не лянуецца прыбрацца тут. Са спадарыняй Валянцінай мы размаўлялі з гадзіну: разам займаліся добраўпарадкаваннем, разам адпачывалі ў цені на лаўцы пры царкве-капліцы. Параіўшыся з ёй, як зручней выйсці да Старой Волі, рушыў я ў няблізкі шлях.

СТАРАЯ ВОЛЯ

Перад вёскай (цяперашняя назва Стараволя), калі ісці з боку Шарашова, ёсць з'езд з асноўнай дарогі. Па ім прамуем на колішнюю сядзібу Жукоўскіх. Дакладней, да таго месца, дзе яна была яшчэ сто гадоў таму. Што сталася і чаму яна не дачакалася часу, калі імя мастака з забыцця гучна вярнулася ў Беларусь? Ад першай згадкі ў 1557-м, калі Старая Воля была падараваная каралевай Бонай Свята-Троіцкаму касцёлу ў Шарашове, і да першай паловы XX стагоддзя гэты маёнтак перамяніў яшчэ нікім не злічоную колькасць гаспадароў. Нехта з іх быў уласнікам (у 1890-м Уладзімір Урэдт), а іншыя, як Жукоўскія, толькі часовымі арандатарамі. Бацькі Станіслава пасяліліся ў Старой Волі пасля 1875-га: нарадзіўся будучы мастак не тут, а ў фальварку Андрухоўцы ў Ваўкавыскім павеце. Але тут прайшлі гады дзяцінства і юнацтва Жукоўскага і нават першыя крокі ў жывапісе — накіды сядзібнага падворка і дома. У 1887 годзе ў Старой Волі ва ўзросце 52 гадоў памерла маці, пакінуўшы на руках мужа траіх дзяцей — старэйшага Баляслава (нар.1863?), Стафанію (нар. 1871?) і Станіслава (1875). Паступова і дзеці вылецелі з гнязда. Спярша Баляслаў, а за ім і астатнія. Калі Жукоўскія з'ехалі са Старой Волі назаўжды, пакуль невядома. Сёння ад старой аднапавярховай драўлянай сядзібы з дзвюма парамі калон на фасадзе ані ні следу — месца былога маёнтка шчыльна забудаванае звычайнымі вясковымі хатамі, а невялічкі ставок паціху зарастае. Зразумела, што такія "аб'екты" мала прыцягальныя для турыстаў. Але ж калі б была адноўлена сядзіба, з'явіліся якія-небудзь дарожныя указальнікі, інфармацыйныя стэнды ды памятны камень, сітуацыя магла б змяніцца кардынальна. Прыклад перад вачыма — сядзіба Напалеона Орды пад Іванавым (дарэчы, не такі знакаміты ў свеце мастак, як Жукоўскі), адноўленая і карыстаецца вялікім попытам у турыстаў. Што гэтаму замінае? Падаецца, толькі мы самі.

Уласна кажучы, хоць імя Станіслава Жукоўскага ўжо стала сваім у Беларусі, беларускае "жукоўсказнаўства" толькі-толькі робіць першыя крокі. Дарэчы, на Пружаншчыне "крокі" можна ўбачыць ужо сёння. У 2003-м, наконадні свята "Дажынкі", на будынку пружанскага ЗАГСа з'явіўся вялізны і прыгожы мурал з выявамі мясцовых знакамітасцй — мастака Станіслава Жукоўскага, пісьменніка Юзафа Крашэўскага і опернага спевака Міхаіла Забейды-Суміцкага. У 2020 годзе мурал быў адрэстаўраваны. У 2015-м у Пружанскім палацыку прайшла сумесная з Нацыянальным мастацкім музеям выстава. Нагодай стала 140-годдзе з дня нараджэння Станіслава Жукоўскага. Тады ж у ваколіцах Стараволі адбыўся мастацкі пленэр, у якім бралі ўдзел дваццаць мастакоў і музыкантаў з Беларусі, Расіі і Узбекістана. Пленэр стаў штогадовым. У межах святкавання юбілею адбылася навуковая канферэнцыя, а пазней у мясцовых СМІ з'явіўся цэлы шэраг артыкулаў, прысвечаных творчасці мастака. І, што немалаважна, у выніку апытанкі, якая была праведзена сярод жыхароў горада і раёна, у Пружанах з'явіліся вуліцы ў гонар славутых землякоў — Станіслава Жукоўскага і Юзафа Крашэўскага.

ЗАСТАЛОСЯ СКАЗАЦЬ

Сапраўды, пасля такіх знакаў пытанне аднаўлення іх сядзіб — проста пытанне часу. Але ж ці не ў тым, каб мы ведалі і шанавалі сваё, і заключаецца мэта патрыятычнага выхавання? А што можа быць лепей, чым пабываць у сядзібе творцы і пачуць пра асобу ды адчуць ягоны час у "жывым месцы", а не ў чыстым полі ці ў хмызах?

Зразумела, многае яшчэ належыць даследаваць і нямала прыйдзецца папрацаваць у архівах, нямала будзе зламана дзідаў у спрэчках. Але мы да таго гатовыя.

Зміцер ЮРКЕВІЧ
Фота аўтара і архіўныя

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: vitebsk-fil.by

• **Вечар нацыянальнага мастацтва** з ансамблем "Талака" да Года міру і стварэння **(6+). 15 чэрвеня ў 19.00.**
• **"Як лялька Ляля ў званочак званіла" (2+)** — класічная музыка для малышоў. **17 чэрвеня ў 11.00.**
• **"Рэй Чарльз: залатыя хіты" (6+)** — класіка амерыканскага джаза ў Віцебскай філармоніі. **17 чэрвеня ў 19.00.**

УНП 300149385

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Трагікамедыя ў 2 дзеях па матывах твора У. Шэкспіра **"Рамэа і Джульета" (12+).** Прэм'ера. Галоўная сцэна. **12 чэрвеня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+).** Прэм'ера. Галоўная сцэна. **13 чэрвеня ў 19.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар" (12+).** Галоўная сцэна. **14 чэрвеня ў 19.00.**
• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **"Чорная панна Нясвіжа" (12+).** Галоўная сцэна. **15 чэрвеня ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Спектакль Башкірскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета **"Пунсовая кветачка" (6+). 10 чэрвеня ў 18.00.**
• Спектакль Башкірскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета **"Легенда пра каханне" (12+). 11 чэрвеня ў 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Лебядзінае возера" (12+). 13 чэрвеня ў 19.00, 18 чэрвеня ў 18.00.**
• Балет у 3 дзеях **"Дон Кіхот" (12+). 14 чэрвеня ў 19.00.**
• Праект заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Аксаны Волкавай **"PRIMA DONNA. Лідзія Галушкіна" (12+).** У межах цыкла "Зоркі Вялікага тэатра Беларусі". Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **14 чэрвеня ў 19.30.**
• Балет у 2 дзеях **"Жыззэль" (12+). 15 чэрвеня ў 19.00.**
• **Гала-канцэрт зорак балета (12+). 16 чэрвеня ў 19.00.**
• Опера-балет у 2 дзеях **"Вілісы. Фатум" (12+). 17 чэрвеня ў 18.00.**
• Канцэрт **"Танец на вадзе" (12+).** Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **18 чэрвеня ў 18.30.**

УНП 191081322

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Імправізацыя ў 2 дзеях **"Казкі пра казку" (6+). 10 чэрвеня ў 11.00.**
• Жарт у 2 дзеях паводле беларускай народнай казкі **"Піліпка і Ведзьма" (5+). 15 чэрвеня ў 18.00.**
• Казка-гульня ў 2 дзеях **"Бука" (3+). 17 чэрвеня ў 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава работ — прызёраў розных гадоў конкурсу-пленэру юных мастакоў імя Міхаіла Сеўрука **"Там, дзе музы падраслі". Да 19 чэрвеня.**
• Выстава **"Вясёлка над Мінскам".** Экспазіцыя юных творцаў і іх настаўніка з Бабруйскай гарадской узорнай дзіцяча-юнацкай студыі выяўленчага мастацтва "Вясёлка". Арт-кафэ музея. **Да 27 чэрвеня.**
• Выстава **"Неба і зямля Аляксандра Кішчанкі"**, прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння мастака. **Да 9 ліпеня.**
• Выстава графікі Леаніда Шчамялёва **"Нараджэнне творчасці"** са збору Нацыянальнага мастацкага музея і з калекцыі сям'і майстра. **Да 10 ліпеня.**
• Экспазіцыя мастацкага шкла 1910–1960-х гадоў **"Асцярожна, посуд!".** Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24. **Да 23 ліпеня.**
• Выстава **"Станіслаў Жукоўскі: пункт прыцягнення — сядзіба". Да 1 кастрычніка.**

• Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Віды і жанры ў выяўленчым мастацтве" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўніх мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у Музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

Наш Telegram-канал. Далучайцеся!

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава выцінанкі Вольгі Налівайка **"Папяровыя мары". Да 29 чэрвеня.**
• Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Сядзібны партрэт".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён,
тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава **"Народнае мастацтва Беларусі XX—XXI стст.". Да 1 жніўня.**
• Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды.**
Працягласць — 2—2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава **"Нацюрморт — прыгажосць у звычайным". Да 27 жніўня.**
• Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**
Падрабязней на сайце artmuseum.by альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Канцэрт класічнай музыкі **"Шапэн у замку" (3+).** Тэатральная зала. **18 чэрвеня ў 13.00.**
• Канцэрт класічнай музыкі **"Мары пра Нясвіж" (3+).** Тэатральная зала. **18 чэрвеня ў 15.00.**
• Выстава **"Летапіс праса: разгладзім старонкі"** з прыватнай калекцыі Барыса Васільева і Юліі Ржэўскай. Малая выставачная зала. **Да 12 лістапада.**
• Праект **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны".** Экспазіцыйная зала першага пускавога комплексу.
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара".** У складзе пастаяннай экспазіцыі.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры",** экспазіцыя Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Часовая выстава мастака Генадзя Чыстага **"Кошык летніх падарункаў". Да 7 жніўня.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу".** З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў Ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (група да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Архітэктурны помнік "Слуцкая брама" (г. Нясвіж, вул. Слуцкая)
• Часовая экспазіцыя **"Нясвіж — скрыжаванне трох хрысціянскіх рэлігій. Храмавае дойлідства". Да 30 верасня.**
Падрабязнасці на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі раён,
Гродзенская вобласць,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Прыгодніцкае шоу **"Бітва за Мір". 11 чэрвеня:**
— **12.30** — збор удзельнікаў ва ўнутраным двары;
— **13.00** — квэст, пераможцы якога ў 14.30 атрымаюць званні, тытулы, прызы, падарункі, выдадуць важныя загады;
— **15.00** — рэгата радыёкіраваных яхт **"Адзін вецер для ўсіх — 2023"** на кубак чэмпіёна "Выспы Тартуга".
• Творчы праект **"Музычныя вечары ў Мірскім замку". 16 чэрвеня:**
— **19.00—21.00** — вялікі канцэрт Заслужанага калектыву "Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі імя М. Я. Фінберга" **"Музыка па-за часам"**;
— **22.00—24.00** — сольны канцэрт заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Вікторыі Алешка **"Сапраўднае золата". 17 чэрвеня:**
— **19.00—21.00** — канцэрт артыстаў беларускай эстрады "Нашы, любімыя";
— **22.00—24.00** — канцэрт запрошанага расійскага выканаўцы — народнага артыста Расійскай Федэрацыі Алега Газманава.
• Выстава **"Мір талентаў". Да 25 чэрвеня.**
• Экспазіцыя **"ARMATUS. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі" (0+).** Паўночны корпус. **Да 31 жніўня.**
• Квэст **"Таямніца двух куфраў". Па суботах у 15.30.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Інтэрактыўная праграма **"Крылатыя абаронцы Радзімы"** на пляцоўцы каля легендарнага самалёта "Лі-2". Папярэдні запіс. **Кожную суботу і нядзелю да верасня.**

У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне музея з экскурсіяй і без яе. Ёсць абанементы: "Сямейны", "Дзіцячы", "Для старшакласнікаў і дарослых".

Падрабязнасці на сайце warmuseum.by.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак — нядзеля з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **"Сны аб Японіі". Да 18 чэрвеня.**

УНП 192543414

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819.**

УНП 100377771

Большой театр Беларуси

объявляет конкурс на замещение вакантной должности по творческой специальности в труппу оркестра — в группу альтов.
Дополнительная информация — на сайте **bolshoibelarus.by.**

Адрес: 220029, г. Минск, пл. Парижской Коммуны, 1.
Телефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819.**

УНП 191081322

Выпісвайце "Культуру" і "Мастацтва" на паўгода!

-15%

Газета "Культура"
Індывідуальны льготны **63872**
Шэсць месяцаў — 75,87 руб.
Ведамасны льготны **638722**
Шэсць месяцаў — 125,67 руб.

Часопіс "Мастацтва"
Індывідуальны льготны **74941**
Шэсць месяцаў — 101,20 руб.
Ведамасны льготны **749412**
Шэсць месяцаў — 198,04 руб.

Выпісваеце на паўгоддзе — эканоміце да 15 %!

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне **8 017 2860797** або на электронную пошту **reklama@kultura-info.by.**

2006 2010 2022
КУЛЬТУРА
Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.

Рэдакцыя газеты "Культура":
Галоўны рэдактар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.
Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.
Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАУРЫЫ, Яўген РАПІН.
Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.
Літаратурны рэдактар — Мацвей ЗАЙЦАЎ.
Мастацкі рэдактар — Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: 8 017 2860797, 8 017 3345723.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.
* — матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2023.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 09.06.2023 у 18.00. Замова № 1273.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
Наклад 3001.